НЯХАЙ ЖЫВЕ НЕПЕРАМОЖНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

1918 1931

Прапетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 52 (3956)
ПАНЯДЗЕЛАК, 23 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Да ўсіх чырвонаармейцаў, кампалітскладу Чырвонай арміі і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі

Трынаццаць год рабоча-сялянская Чырвоная армія няўхільна стаяла на варце заваяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі. У агні пераможнай барацьбы рабочае клясы і сялянства за Савецкую ўладу нарадзілася, загартавалася і вырасла слаўная Чырвоная армія ў магутны ўзброены атрад сусьветнага пралетарыяту.

Сучаснае міжнароднае становішча патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня баяздольнасьці Чырвонай арміі і яшчэ большай увагі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці да будаўніцтва Чырвонай арміі.

ТАВАРЫШЫ! Буржуазія добра сабе ўяўляе, што выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, індустрыялізацыя СССР, калектывізацыя савецкай вёскі непамерна ўзмацняюць пазыцыі сацыялізму і ператвараюць Савецкі Саюз у непераможную крэпасьць сусьветнага пралетарыяту. Гэта выклікае зьвярыную нянавісьць усіх заядлых ворагаў пралетарскай рэвалюцыі да першай у сьвеце бацькаўшчыны рабочае клясы. Бурны рост савецкай краіны праходзіць пры катастрафічным заняпадзе капіталістычнага сьвету. Капіталізм корчыцца ад эканамічнага крызісу, які ўсё паглыбляецца, перарастае ў крызіс палітычны і расхіствае асновы капіталізму. Нястрыманае зьмяншэньне вырабу прамысловасьці, заняпад сельскай гаспадаркі, вялізарнейшы рост беспрацоўя ва ўсіх дзяржавах капіталізму абвастраюць непамерна клясавыя супярэчнасьці, набліжаюць пагібель капіталізму. Буржуазія перад сваім канцом у сьмяротным страху перад сусьветнай рэвалюцыяй ліхаманкава падрыхтоўвае і набліжае напад фашысцкіх банд на СССР. Пагроза вайны з кожным днём расьце. Імпэрыялісцкія драпежнікі чакаюць толькі моманту, каб спусьціць з ланцугоў сваіх верных сабак—фашыстаў і белагвардзейскую зграю.

Патокамі крыві рабочых і сялян, мільёнамі скалечаных, давядзеньнем да роспачы і галечы дзесяткаў мільёнаў людзей, імпэрыялісты хочуць выратаваць капіталістычны сьвет ад нямінучай пагібелі.

ТАВАРЫШЫ! Перад тварам узмоцненай пагрозы вайны ў дзень 13-ай гадавіны Чырвонай арміі Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі заклікае ўсіх працоўных да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны Саветаў, да ператварэньня Савецкай Беларусі ў баявы фарпост СССР на межах з капіталізмам. Перад рабочай клясай, сялянствам, часьцямі Чырвонай арміі БССР стаяць вялізарныя задачы, якія будуць выкананы пад кіраўніцтвам партыі Леніна.

ПЕРШАЯ ЗАДАЧА—усямернае ўзмацненьне сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны, праз выкананьне і перавыкананьне пляцігодкі, што забясьпечыць сканчэньне пабудовы фундаменту сацыялізму. Пралетары БССР на падрыхтоўку вайны імпэрыялістамі павінны адказаць новым магутным уздымам творчага энтузіязму. Даць новыя тысячы ўдарнікаў і змагацца за якасьць, аўладаць тэхнікай, рашуча па-бальшавіцку выкрываць шкодніка ў весьці з імі бязьлітасную барацьбу, шырай разгарнуць масавую сацыялістычную рацыяналізацыю, выканаць і перавыканаць прамфінпляны 3-га рашаючага году пяцігодкі, забясьпечыць выкананьне пяцігодкі за чатыры гады і тым самым узмацніць базу абароназдольнасьці краіны.

ДРУГАЯ ЗАДАЧА — бальшавіцкае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, ударнае сканчэньне выкананьня ўсіх заготовак павінна даць новую хвалю калгаснага прыпліву. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва—асноўнай апоры інтэрвэнтаў, забясьпечыць яшчэ больш шпаркія тэмпы разьвіцьця ўсёй народнай гаспадаркі СССР і ператварыць СССР у непераможную краіну пралетарскай дыктатуры. Лепшым узмацненьнем абароны краіны Саветаў будзе ўдарнае правядзеньне веснавой сяўбы, арганізаваная жорсткай магутнай хвалі калгаснага прыпліву.

ТРЭЦЯЯ ЗАДАЧА—баявая падрыхтоўка, баявая здольнасьць, тэхнічная забясьпечанасьць Чырвонай арміі. Чырвонаармейцы і кампалітскład павінны аддаць усе свае сілы для аўладаньня баявымі ведамі і тэхнікай з тым, каб быць падрыхтаванымі і пільна сачыць за аховай творчай гістарычнай работы працоўных СССР. Чырвоная армія—узброены атрад пралетарыяту— зьяўляецца адначасовай школай будаўніцтва сацыялізму. За індустрыялізацыю краіны, калектывізацыю, за бальшавіцкія тэмпы работы, чырвонаармейцы павінны быць і ў сваіх часьцях, і на заводах, і на вёсках у першых радах.

Гэраічнае мінулае Чырвонай арміі, 13-гадовая работа па арганізацыі ўзброенага атраду рабочай клясы, посьпехі пераможнага сацыялізму павінны выхаваць стойкіх, умелых і адданых байцоў за справу камунізму.

ЧАЦЬВЕРТАЯ ЗАДАЧА—штодзённая ўвага справе абароны СССР і пралетарскія клопаты і дапамога Чырвонай арміі. Наша армія магутна тым, што яна моцна зьвязана са сваёй клясай і пад кіраўніцтвам авангарду пралетарыяту—камуністычнай партыі (бальшавікоў) выкоўвае байцоў, адданых справе сацыялізму. Заводы і фабрыкі павінны яшчэ больш увагі зьвярнуць на справу сьцісłай сыстэматычнай сувязі і дапамогі Чырвонай арміі. Праз узмацненьне і пашырэньне шэфства, праз сутаварыства з часьцямі Чырвонай арміі пралетарыят павінен павышаць пралетарскую свядомасьць байцоў, павінен перадаваць свой вопыт сапраўдных ударных тэмпаў работы, павінен дапамагчы тэхнічнымі навыкамі і ведамі чырвонаармейцам.

ТАВАРАШЫ! Пастаўленыя задачы будуць выкананы пры ўмове няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі і барацьбы з усімі праціўнікамі сац. будаўніцтва, у першую чэргу з правымі апартуністамі, з «левымі» ўхілістамі, з найбольш небясьпечным зараз вялікадзяржаўным шавінізмам, з беларускім контр-рэвалюцыйным нац-дэмакратызмам—агентам польскага фашызму і шавіністамі ўсіх колераў.

Больш клясавай пільнасьці.

Давайце руйнуючы адпор усім клясавым ворагам, шкоднікам, усім, хто адважыцца паўстаць на шляху пераможнага сацыялізму.

Чырвонаармейцы, кампалітскład, рабочыя, калгасьнікі, беднота і серадняк! —за ударную работу, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за ўзмацненьне абароны СССР пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!

ЦК КП(б)Б.

На варце выкананьня пяцігодкі за 4 гады

Усякі раз, калі мы сьвяткуем гадавіну нашай гэраічнай Чырвонай арміі, мы з асаблівай увагай падыходзім да пытаньняў міжнароднага становішча Савецкага Саюзу. Мы гэта прымушаны рабіць таму, што супроць краіны, дзе будуецца сацыялізм, стаіць сьвет імпэрыялістычных драпежнікаў, гатовы ў кожную хвіліну арганізаваць узброены напад на СССР.

Яшчэ ў 1920-м годзе Ленін у адным з сваіх выступленьняў на II-м кангрэсе Камінтэрну моцна падкрэсьліваў, што ад часу Кастрычніцкай рэвалюцыі АСНОЎНАЙ СУПЯРЭЧНАСЬЦЮ, якая падзяляе сьвет на два непрымірымых лягеры, зьяўляецца супярэчнасьць паміж краінай пралетарскай дыктатуры і краінамі, дзе яшчэ пануе капітал. Увесь апошні пэрыяд часу, увесь апошні год мы бачым, як сталь з кожным днём, абвастраецца гэта супярэчнасьць. Прычыны абвастрэньня заключаюцца ў тым, што на гэтых двух сацыяльна-процілеглых канцах сусьвету адбываюцца зусім процілеглыя працэсы.

Мы ў нашай краіне за апошні год зрабілі магутны крок у галіне будаўніцтва сацыялізму. 1930 год даў нам у маштабе СССР каля 30 ПРОЦ. прросту прамысловай прадукцыі. 1931 год уводзіць у строй 500 новых прадпрыемстваў-гігантаў. У СССР цалкам ліквідавана беспрацоўе. Мы вырашылі збожжавую праблему. Мы стаім на шляхох да пасьпяховага вырашэньня мясной праблемы. Асноўныя масы бядняка-серадняцкага сялянства, якія павярнуліся да сацыялізму, ідуць у калгас. 50 проц. калектывізаваных сельскіх гаспадарак — гэта ўжо дае нам усе шансы пасьпяховага вырашэньня пытаньне—«хто — каго» ў галіне сельскай гаспадаркі так, як гэта пытаньне ВЫРАШАНА ЎЖО Ў ГАЛІНЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. На падставе сусьпільнай калектывізацыі ліквідуецца кляса самых зьверскіх ворагаў пралетарскай дыктатуры — кулацтва. На фабрыках і заводзях, у капальнях і на лесараспрацоўках расьце і ўзьнімаецца вялікая хваля новых форм сацыялістычных адносін да працы. Бальшавіцкая партыя, як ніколі, карыстаецца вялікім даверэм рабочай клясы, апіраецца ў вёсцы на калгасьнікаў, бядняцтва, замацоўваючы саюз з серадняком-аднаасобнікам. У 1931 годзе мы завяршаем пабудову фундаменту сацыялістычнай эканомікі.

А ШТО РОБІЦЦА ПА ДРУГІ БОК МЯЖЫ? — Там мы бачым вялізарны эканамічны крызіс, якім ахоплены самыя магутныя краіны капіталу. Падваліны капіталістычнай эксплёатацыі і парадку падмываюцца хвалямі ўзрастаючай рэвалюцыйнай барацьбы шматмільённых мас працоўных. Мільёны галодных, 60 млн. беспрацоўных — вось найбольш тыповыя прыкмеры для сучаснага становішча капіталістычных краін. І недарма адна буржуазная газэта, характарызуючы становішча Эўропы, піша: «Хваля пасымізму заліла Эўропу... Хвароба зьяўляецца арганічнай, глыбока закранаючай, упартай і злосьлівай. Гаспадарчая ідыцына заспавала, каб ужыць радыкальныя сродкі пячэньня». Некаторыя, хто хоча зразумець будучыню, чэрпае свае дагадкі ў мінулым — «будзе так, як на тыпох у часе сусьветнай вайны», або «будзе бальшавізм на Захадзе...» Вось як малюе сытуацыю капіталістычных краін сама-ж буржуазная газэта.

Для кожнага з нас ясна, якім глыбокім зьяўляецца той водападзел, які падзяляе сьвет на дзьве часткі. Тав. ГЕЙ у сваёй прамове на X зьезьдзе саветаў прывёў прыклад становішча Зах. Беларусі, супаставіўшы яе становішча з тым, што робіцца ў нас, у БССР. Гэтага супастаўленьня даволі, каб зразумець, што НАШЫ МЕЖЫ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА МЕЖАМІ ДЗЬВЁХ СЫСТЭМ, ДВУХ РОЗНЫХ ПРАЦЭСАЎ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА ПА АБОДВУХ БАКОХ ГЭТАЙ МЯЖЫ.

Вось з гэтых супярэчнасьцяй, якія абвастраюцца паміж СССР і краінамі імпэрыялістычнага панаваньня, вынікае рост ваеннай агрэсыўнасьці і з боку буржуазных краін у адносінах да нашага Саюзу. З таго, што мы, наш Саюз, зьяўляецца цэнтрам, які прыцягвае да сябе ўзрастаючыя рэвалюцыйныя сымпатыі белых, жоўтых і чорных рабоў капіталу, выцякае рост клясавай нянавісьці з боку буржуазіі да СССР. З таго, што мы пасьпяхова праводзім наш пяцігадовы плян, з таго, што пяцігодка прызнана як рэальны факт усёй буржуазіяй, з таго, што мы самым сваім існаваньнем разбураем фундаменты капіталістычнага парадку, выцякае рост ваеннай небясьпекі.

Зараз, калі мы праводзім XIII ГАДАВІНУ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ — ваенныя хмары з асаблівай сілай згушчаюцца над сьветам. Пытаньні вайны і перш за ўсё вайны супроць Савецкага Саюзу, у якой капіталісты ўсіх краін шукаюць сродкаў да вырашэньня сваіх труднасьцяй і супярэчнасьцяй, стаяць у парадку дня. Працэс «прампартыі», арышт беларускіх нацдэмаў агалёў антысавецкія, імпэрыялістычныя пляны міжнародных інтэрвэнтаў.

За апошнія тыдні ў буржуазных дзяржавах мае месца новая дзікая сьвістапляска вакол сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Гэта кампанія зараз ідзе пад выглядам барацьбы супроць так званага «савецкага дэмпінгу» і «прымусовай працы», якая быццам ужываецца ў Савецкім Саюзе, і ў прыватнасьці, на нашых лесараспрацоўках. Амэрыканскія, ангельскія, французкія і польскія цьвёрдапобыя рабаўласьнікі аб'ядналіся ў адзінай барацьбе супроць нашай пяцігодкі. Кампанія аб «прымусовай працы» павінна служыць у руках гэтых капіталістычных рабаўласьнікаў, гэтых мацёрых прадстаўнікоў самай агідной эксплёатацыі і ўдзку для таго, каб зваліць на СССР прычыны крызісу ў капіталістычных краінах і каб рыхтаваць эканамічную блёкаду і вайну. Кампанія аб «прымусовай працы» і «савецкім дэмпінгу» зьяўляецца вылазкамі найбольш заяўлых атрадаў міжнароднага імпэрыялізму супроць СССР, зьяўляецца папулярызацыяй тых лёзунгаў, якія пішуць сусьветныя разбойнікі капіталу на сьцягах антысавецкай інтэрвэнцыі. Так і толькі так трэба ацэньваць гэту новую кампанію хлусьні, за якой стаяць генэральныя штабы імпэрыялістычных армій, якую інсьпіруюць Дэтэрдынгі, «Комітэ дэ форж» містэры Фішы, польскія магнаты Радзівілы і іншыя магнаты і прадстаўнікі сусьветнага капіталу, якія перапалоханы пераможным будаўніцтвам сацыялізму ў СССР.

Сацыял-фашысты ідуць як заўсёды наперадзе антысавецкай кампаніі і падрыхтоўкі антысавецкай інтэрвэнцыі. Пацыфісцкія фразы скарыстоўваюцца імі таксама як і дымлёматамі буржуазіі для таго, каб ашукаць масы і з яшчэ большай актыўнасьцю падрыхтоўваюць вайну. «ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ ПАЦЫФІЗМ ЕСЬЦЬ ІНСТРУМАНТ ПАД РЫХТОЎКІ ВАЙНЫ І ПРЫКРЫЦЬЦЯ ГЭТАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ФАРЫСЕЙСКІМІ ФРАЗАМІ АБ МІРЫ. БЕЗ ТАКОГА ПАЦЫФІЗМУ І ЯГО ІНСТРУМАНТУ, ЛІГІ НАЦЫЙ, ПАДРЫХТОЎКА ВОЙН У ЦЯПЕРАШНІХ УМОВАХ НЕМАГЧЫ МА» (Сталін). Сацыял-фашысты, гэтыя «лейтэнанты сусьветнага капіталу», як іх называў Ленін, актыўна карыстаюцца гэтым інструмантам для таго, каб яшчэ з большай сілай дваваць СССР і рыхтаваць ваенны паход на краіну пралетарскай рэвалюцыі.

У гэтых умовах, калі небясьпека вайны абвастраецца з кожным днём, калі ўсе чорныя сілы сусьветнай рэакцыі працуюць над тым, каб акружыць СССР жалезным колам эканамічнай блёкады, задача абароны нашай рэвалюцыі, нашай мірнай сацыялістычнай працы зьяўляецца ПЕРШАЧАРГОВАЙ ЗАДАЧАЙ. І аб гэтай задачы мы гаворым і ўспамінаем ня толькі ва ўрачыстыя дні сьвяткаваньня нашых юбілеяў. АБ ГЭТЫМ МЫ ГАВОРЫМ І Ў ГЭТЫМ НАПРАМКУ МЫ РОБІМ КОЖНУЮ ГАДЗІНУ І КОЖНЫ ДЗЕНЬ.

Мы скінулі эксплёататараў, наша гэраічная армія перамагла ворага на шмат пініх фронтох грамадзянскай вайны, мы зараз будуем новае сацыялістычнае грамадзтва, але клясавы вораг ня зьнішчан яшчэ да канца ўнутры краіны, але мы знаходзімся яшчэ ў акружэньні капіталістычных краін, дзе пануючая буржуазія рыхтуецца да вайны супроць нас. І мы, памятаючы тое, што гаварыў Ленін, застаемся рэвалюцыянэрамі да канца. Мы з усіх сіл працуем над тым, каб узмацніць узброеныя сілы нашай рэвалюцыі, каб быць гатовымі ў кожную хвіліну са зброяй у руках даць адпор націску эксплёататараў.

Асновай узмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны зьяўляюцца сапраўды бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, якое ідзе па шляхох нашай партыі. БАРАЦЬБА ЗА ТЭМПЫ, БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ — гэта адначасова і ЎЗМАЦНЕНЬНЕ НАШАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, гэта ад начасова ўзмацненьне абароназдольнасьці ўсёй Савецкай краіны.

XIII гадавіну Чырвонай арміі мы сустракаем, калі пралетарскія масы СССР і іх авангард — бальшавіцкая партыя па закліку свайго правадыра узяліся па-бальшавіцку ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ, НАВУКАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Выкананьне гэтага пёзунгу ёсьць ня толькі вырашэньне важнейшых задач у далейшым пасьпяховым разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва, але і вырашэньне задач па ўмацаваньні абароназдольнасьці нашай краіны. ГЭТЫ ЛЁЗУНГ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЦЭНТРАЛЬНЫМ ЛЁЗУНГАМ І ДЛЯ НАШАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. Барацьба за самую высокую тэхніку, барацьба за высокакваліфікаванага бойца і камандзіра Чырвонай арміі — вось галоўныя задачы, якія стаяць перад нашай арміяй. XIII гадавіна пройдзе пад знакам папулярызацыі і далейшага ажыцьцяўленьня гэтага пёзункту. АРМІЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, АРМІЯ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ БЫЛА І БУДЗЕ ЎЗБРОЕНА ДАСКАНАЛАЙ ТЭХНІКАЙ, БУДЗЕ ЎМЕЛА ЕЮ ЎЛАДАЦЬ.

Шырокія працоўныя масы яшчэ больш акружаць армію атмасфэрай актыўнага падтрыманьня. Сувязь паміж рабочай клясай і яе ўзброенымі сіламі была, ёсьць і будзе зарукай нашай непераможнасьці. Мы добра ведаем, што ў тых баёх, якія чакаюць савецкі і міжнародны пралетарыят, на баку нашай арміі будуць рабочыя і працоўныя масы ўсіх капіталістычных краін. Чырвоны сьцяг СССР, пад якім перамагала наша Чырвоная армія, пад якім яна цьвёрда стаіць зараз на варце савецкіх межаў, зьяўляецца адначасова і сьцягам усіх рэвалюцыйных атрадаў міжнароднага пралетарыяту, якія змагаюцца супроць сваёй упаснай буржуазіі.

Напад ворага ня зьявіцца для нас нечаканым. Пад зброю Чырвонай арміі стануць мільёны працоўных, гатовых змагацца за СССР, за перамогу сацыялізму, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

„Пралетарыят БССР павінен удзесяцярыць сваю пільнасьць“

Да ўсіх членаў прафсаюзаў і прафарганізацый БССР

Дарагія таварышы!

XIII-я гадавіна слаўнай Чырвонай арміі, вернага вартаўніка заваяваньняў Кастрычніка, праходзіць у гэтым годзе ва ўмовах разгорнутага пераможнага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, ва ўмовах пасьпяховага ажыцьцяўленьня 5-годкі за чатыры гады.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі пралетарыят Савецкага Саюзу, вядучы рашучую барацьбу з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, яшчэ шчыльней канцэнтруючы навакол сваёй партыі магутныя пралетарскія рады, разьвіваючы высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе найцырэйшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва — пасьпяхова вырашае ў 3-м рашаючым гістарычным годзе пяцігодкі задачу завяршэньня пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Гэраічная барацьба пралетарыяту СССР за справу пабудовы першай у сьвеце краіны сацыялізму, рэвалюцыянізуючы і арганізуючы пралетарыят усяго сьвету на барацьбу з сусьветным імпэрыялізмам, на справу заваланьня сусьветнага Кастрычніка, выклікае жорсткае супраціўленьне клясавага ворага ўнутры краіны і ярасьць сусьветнага імпэрыялізму, які ліхаманкава рыхтуецца да вайны з СССР.

«Сёньня» капіталістычнага сьвету — гэта ўсё ўзрастаючы эканамічны і палітычны крызіс капіталізму, усё большае абвастрэньне супярэчнасьцяй, крызіс перавытворчасьці, наступленьне на рабочую клясу, жахлівыя разьмеры беспрацоўя, нячуваная галеча, голад мільённых мас рабочых, працоўных, дзікі разгул фашызму, спрэдня-вяковыя ката ваньні ў засьценках дыфэнзывы, сігуранцы і г. д. — з аднаго боку, і бязупынны рост рэвалюцыйнага руху пралетарыяту пад штандарамі кампартыі — з другога боку.

«Сёньня» БССР, як і СССР — гэта бурны росквіт краіны дыктатуры пралетарыяту, бурны размах тэмпаў індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, вялізарны рост культурна-палітычнага ўзроўню мас, поўная ліквідацыя беспрацоўя і бязупынны працэс паляпшэньня сацыяльна-бытавых умоў рабочых і працоўных мас.

Посьпехі Савецкага Саюзу ў індустрыялізацыі краіны, у калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ў ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі выклікалі шалёную нянавісьць сусьветнай буржуазіі, якая не знаходзіць выхаду з глыбокага эканамічнага крызісу, які ахапіў усе капіталістычныя краіны, і якая імкнецца шляхам новых крывапралітных войн, у першую чаргу, шляхам нападу на СССР, знайсьці выхад з тупіку, задушыць сацыялістычную бацькаўшчыну пралетарыяту ўсяго сьвету.

Перад тварам узросшай небясьпекі нападу сусьветнай буржуазіі на СССР, пралетарыят БССР павінен удзесяцярыць сваю пільнасьць, павінен з яшчэ большым посьпехам узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны, дапамагчы Чырвонай арміі яшчэ больш узмацняць сваю тэхнічную баявую магутнасьць.

Слаўная непераможная Чырвоная армія, народжаная Кастрычнікам, вырасшая, узмацнелая і загартаваная ў жорсткіх клясавых баёх з сусьветнай буржуазіяй, — моцна тым, што яна абараняе сваю ўладу, уладу саветаў, сваю краіну — краіну дыктатуры пралетарыяту, моцна сваёй арганічнай сувязьзю з працоўнымі.

У дзень XIII-й гадавіны Чырвонай арміі, пралетарыят БССР — перадавы фарпост СССР, павінен яшчэ больш узмацніць гэту сувязь, увагу і клопаты да Чырвонай арміі.

Прэзыдыум ЦСПСВ ад імя 300.000 арганізаваных у прафсаюзы рабочых і працоўных Савецкай Беларусі, прымаючы ў дзень XIII-цігодзьдзя Чырвонай арміі шэфства над Н-й Авіябрыгадай, заключае з ёю сацыялістычны дагавор.

ЦСПСВ ад імя рабочых БССР, прымаючы на сябе абавязкі, якія поўнасьцю забясьпечваюць выкананьне грандыёзных задач, што стаяць перад рабочай клясай БССР у справе выкананьня 5-годкі за 4 гады, на падставе сапраўднага ўзгаўлёньня творчага энтузіязму і энэргіі рабочае клясы і пакіраваньня іх на вырашэньне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе поўнага перабудаваньня работы прафсаюзаў зьверху данізу «тварам да вытворчасьці».

Лётна - тэхнічны і чырвонаармейскі склад Авіябрыгады ў сваю чаргу прымае на сябе адказную задачу максымальнага ўдасканаленьня, узмацненьня баяздольнасьці і аўладаньня вайсковай тэхнікай, з тым, каб на першым заліку партыі даць канчаткова адпор усім тым, хто зробіць замах на мірнае будаўніцтва ў надыходзячых рашучых клясавых баёх.

На поўнае выкананьне і перавыкананьне ўзятых на сябе абавязкаў, на далейшае ўзмацненьне сувязі пралетарскіх мас з Чырвонай арміяй, на далейшае ўзмацненьне яе баявой і тэхнічнай магутнасьці — павінна быць накіраваны ўсе сілы і энэргія рабочае клясы БССР.

Работа па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны павінна стаць штодзённай задачай усіх прафесыянальных арганізацый, усіх членаў прафсаюзаў, як неадлучная важнейшая частка работы, якая забясьпечвае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва.

Няхай жыве партыя бальшавікоў — правадыр і арганізатар Чырвонай арміі!
Няхай жыве Чырвоная армія—узброены атрад пралетарыяту!

ЦСПСБ.

Загад РВС СССР № 5

ад 23-га лютага 1931 г.

Гор. Масква.

Зьнітаваная, заўсёды гатовая да абаронаў сілах Чырвоная армія ўступае ў 14-ты год свайго існаваньня.

Міжнародны імпэрыялізм, які разьдзіраецца шматлікімі зьнешнімі і ўнутранымі супярэчнасьцямі, паштурхоўваемы жорсткім эканамічным крызісам, які выклікае вялізарныя палітычныя эрухі, шпаркімі крокамі ідзе да другой, яшчэ больш крывавай, чым першая, сусьветнай вайны. У першую чаргу рыхтуецца інтэрвэнцыя супроць Савецкага Саюзу. Вялізарнейшыя перамогі сацбудаўніцтва ў СССР, якія забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, а па рашаючых галінах прамыслоўнасьці—за тры гады, і якія завяршаюць у багучым годзе пабудову фундаменту сацыялістычнай эканомікі,—выклікаюць жывотны страх у імпэрыялістаў.

Злобная нянавісьць наскрозь мілітарызацкіх, варожых першай у сьвеце пралетарскай дзяржаве краін імпэрыялізму з кожным днём праяўляецца ва ўсё больш адкрытых і наглых формах. Пад заслонай нячуванай хлусьні аб «мнімым савецкім дэмпінгу» і аб нібы «прымусовай працы», пад прыкрыцьцём абману і правакацыі буржуазныя штабы распрацоўваюць апэрацыйна-стратэгічныя пляны нападу на пралетарскую дзяржаву, падлічваюць і расстаўляюць свае сілы, намячаюць ударныя групоўкі і разьмяркоўваюць ролі паміж удзельнікамі.

У гэтых умовах падрыхтоўкі імпэрыялізмам новай інтэрвэнцыі мы зноў і зноў заяўляем, што палітыка савецкай улады была, ёсьць і будзе палітыкай міру. Усё што ў моцы нашай краіны, мы робім і будзем рабіць, каб папярэдзіць вайну, каб забясьпечыць мірную працу рабочых і сялян, якія будуюць сацыялізм. Ніякіх заваяваньняў савецкая ўлада ня хоча, але і сваіх зямлі нікому нарушыць не дазволіць. Усе працоўныя СССР аднадушна падзяляюць словы тав. Сталіна, сказаныя ім на XVI партыйным зьезьдзе: «І пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі піводнага вяршка не аддамо нікому».

Пагроза новай інтэрвэнцыі з боку ўзброенага да зубоў імпэрыялізму патрабуе ад рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, ад рабочай клясы, ад усіх працоўных яшчэ большай пільнасьці, яшчэ большай увагі да абароны СССР, яшчэ больш высокіх тэмпаў падрыхтоўкі да абароны СССР. Выкананьне гэтай задачы патрабуе ад РСЧА далейшага павышэньня кваліфікацыі яе асабістага складу, вымагае сапраўдных ударных тэмпаў ва ўсіх галінах работы. Партыйная арганізацыя, камандзіры, палітработнікі і байцы павінны разгарнуць сапраўды бальшавіцкую энэргію ў справе баявой падрыхтоўкі.

Рэвваенсавет Саюзу вітае ўсіх байцоў, камандзіраў і палітработнікаў РСЧА з XIII гадавінай і выказвае непахісную веру, што і ў мірны час у справе баявой вучобы і ўдасканаленьня і ў часе ваеннай грозы ў выпадку новай інтэрвэнцыі — Чырвоная армія рабочых і сялян разам з усімі працоўнымі Савецкага Саюзу і пры брацкім падтрыманьні працоўных усяго сьвету, пад ленінскім кіраўніцтвам нашай кампартыі выканае свой рэвалюцыйны абавязак так, як гэта належыць арміі пралетарскай дыктатуры.

РВС Саюзу шле чырвонаармейскае прывітаньне [illegible], калгасьнікам і усім працоўным Савецкага Саюзу, пралетарам і прыгнечаным народам усяго сьвету, якія змагаюцца за вызваленьне ад капіталістычнага рабства.

Няхай жыве XIII гадавіне РСЧА!

Няхай жывуць ударныя бальшавіцкія тэмпы баявой падрыхтоўкі і аўладаньня ваеннай тэхнікай!

Няхай жыве правадыр Чырвонай арміі —усесаюзная партыя і яе ленінскі ЦК!

Нарком па ваенных і марскіх справах і старшыня Рэвваенсавету Саюзу, плоць ад плоці рабочых, калгасьнікаў, вясковай беднаты і серадняцкіх мас нашай вёскі—пільна сочыць за лягерам ворагаў і, вывучаючы баявую справу, у любы момант гатова паўстаць на абарону пяцігодкі.

Магутнасьць Чырвонай арміі, цэмэнт, які згуртоўвае яе, — ленінская тэорыя, усьпрыняятая клясава-сьвядомай масай байцоў, камандзіраў і палітработнікаў.

Генэральная лінія партыі — вось шлях, па якім Чырвоная армія разам з усёй краінай прасоўваецца, мацнее і расьце.

Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады падвяло базу пад тэхнічную рэканструкцыю Чырвонай арміі.

Партыя дала лёзунг: «Пяцігодку павінна абараняць Чырвоная армія, насычаная тэхнічнымі сродкамі барацьбы».

З мінулага году Чырвоная армія, пачынаючы з пізавога зьвяна і канчаючы вышэйшымі штабамі, пачала па-бальшавіцку перабудоўвацца на новай тэхнічнай базе.

Тэхніка, якую Чырвоная армія мае, зьяўляецца выключна рэзультатам бальшавіцкага выкананьня пяцігодкі. Ні на адну сакуплу партыя не за-

ПАРТЫЯ І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

Адыходзячы ад нас, тав. Ленін наказаў нам умацоўваць і паляпшаць стан Чырвонай арміі. «Клянемся табе, тав. Ленін, што мы не пашкадуем сіл сваіх, каб выканаць гэту тваю запаведзь».

За сьпіной 13 год. Чырвоная армія, якая кіруецца ленінскай партыяй, упісала не адну слаўную старонку ў гісторыю барацьбы працоўных усяго сьвету супроць заможных клясаў.

Паступіўшы пасьля грамадзянскай вайны пэрыяд «мірнай перадышкі», які знаходзіцца кожную хвіліну пад пагрозай зрыву, ставіць перад Чырвонай арміяй задачу — быць гатовай у любы момант адбіць спробы інтэрвэнцыі.

Упартая работа на баявой вучобе пад лёзунгам — быць гатовым у любы момант выступіць на абарону СССР — вось будні Чырвонай арміі. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам сваёй партыі, руйнуючы шалёнае супраціўленьне кулака і нэпмана ўнутры краіны, бязьлітасна выкрываючы падкопы міжнароднай буржуазіі, будуе сваю пяцігодку.

«Ударная брыгада пралетарыяту ўсіх краёў» знаходзіцца пад пагрозай вялікарэйшага нападу, як гэта выкрыў працэс «прампартыі». Чырвоная Саюзу, плоць ад плоці рабочых, калгасьнікаў, вясковай беднаты і серадняцкіх мас нашай вёскі—пільна сочыць за лягерам ворагаў і, вывучаючы баявую справу, у любы момант гатова паўстаць на абарону пяцігодкі.

Магутнасьць Чырвонай арміі, цэмэнт, які згуртоўвае яе, — ленінская тэорыя, усьпрыняятая клясава-сьвядомай масай байцоў, камандзіраў і палітработнікаў.

Генэральная лінія партыі — вось шлях, па якім Чырвоная армія разам з усёй краінай прасоўваецца, мацнее і расьце.

Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады падвяло базу пад тэхнічную рэканструкцыю Чырвонай арміі.

Партыя дала лёзунг: «Пяцігодку павінна абараняць Чырвоная армія, насычаная тэхнічнымі сродкамі барацьбы».

З мінулага году Чырвоная армія, пачынаючы з пізавога зьвяна і канчаючы вышэйшымі штабамі, пачала па-бальшавіцку перабудоўвацца на новай тэхнічнай базе.

Тэхніка, якую Чырвоная армія мае, зьяўляецца выключна рэзультатам бальшавіцкага выкананьня пяцігодкі. Ні на адну сакуплу партыя не за-

УсеКП(б)—АРГАНІЗАТАР І ПРАВАДЫР

УЗБРОЕНЫХ СІЛ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

НЕПЕРАМОЖНАСЬЦЬ, СІЛА І МАГУТНАСЬЦЬ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—Ў ЯЕ КЛЯСАВАЙ СЬВЯДОМАСЬЦІ І МОЦНАЙ НЕПАРЫЎНАЙ СУВЯЗІ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ І АСНОЎНЫМІ МАСАМІ СЯЛЯНСТВА, У ТЫМ, ШТО ЁЮ КІРУЕ, ЯЕ ВЫХОЎВАЕ СТАЛЁВАЯ І МАНАЛІТНАЯ ПАРТЫЯ ЛЕНІНА

ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЬ У ЗМАГАНЬНІ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, ЗА ПАВЫШЭНЬНЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ АДЗІНАЙ У СЬВЕЦЕ КРАІНЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

Міжнародны рэвалюцыйны рух і Чырвоная армія

Развах сусьветнага капіталізму ўсё больш і больш пагыбляецца. Яшчэ год таму назад ня толькі буржуазія і сацыял-фашысты, але нават і правыя партыйсты ўказвалі на ПАЗШ, як на прыкладную капіталістычную краіну, якое не датычыць эканамічны крызіс і наватازмуляецца ўзорам для ўсяго капіталістычнага сьвету.

РВС БВА т. т. Ягораў, Гей, Аранштам.

Адтак, прашоў год, і што-ж стала з гэтай краіны славутага «процвітаньня», з гэтай цытадэлі сусьветнага капіталізму?

Ад славутага «процвітаньня» не засталося і сьледу. **Капіталістычная стабілізацыя ў гэтай цытадэлі капіталізму даўно памула ў ня...** Прадукцыя ва ўсіх галінах прамысловасьці ПАЗШ скарачаецца. Кожны дзень закрываюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, а дзесяткі тысяч рабочых выкідаюцца на вуліцу. **Выплаўка чыгуна за 1930 год знізілася на 26 проц., сталі — на 27 проц.**

Экспарт аўтамабільнай прамысловасьці **скараціўся на 50 проц.** Паводле даных за 1930 год у Амэрыцы не скарыстоўвацца **каля 8.000 паравозаў і 100.000 вагонаў.**

Збанкрутавала звыш 1.326 банкаў на суму **904 млн. даляраў супроць 234 млн.** у 1929 г. У краі налічваецца зараз **звыш 10 млн. беспрацоўных.** Зарплата знікана амаль напалову. І гэта — у цытадэлі капіталізму.

Яшчэ горшая справа ў іншых капіталістычных краінах. Адно толькі скарачэньне сусьветнага гандлю **на 12-13 млрд. даляраў** само гаворыць за сябе. Паводле «Эканаміста», сусьветныя цэны **на розныя прадукты зьнізіліся: на пшаніцу — на 53,8 проц., бавоўну — 45,5 проц., джут — 44,5 проц., воўну — 33.3 проц., волава — 34,6 проц., медзь — 41,6 проц., каўчук — 47,3 проц.**

Калі да гэтага дадаць, што толькі ў Эўропе і Амэрыцы зараз галадае **звыш 120 млн. чал.**, паводле даных Міжнароднага прафсаюзу, што ў **Паўднёвай Амэрыцы** беспрацоўных і поўбеспрацоўных налічваецца **звыш 4 млн. чал., у Кітаі** — ня менш **10 млн. беспрацоўных і поўбеспрацоўных**, 4 млн. памёрла з голаду ў правінцыі Гуансі, а ў 70 паветах гэтай правінцыі галадае **14 млн.**, калі ў **Індыі**, паводле падлікаў навет буржуазных эканамістаў, **12 млн. беспрацоўных, 1 з пал. млн. беспрацоўных у Японіі, звыш 2 млн. галодных беспрацоўных блукаюць па вуліцах гарадоў Фармозы, Філіпін, Інданэзіі** і інш. краін Ціхага акіяну, дык малюнак поўнага загніваньня і развалу капіталізму паўстае перад намі ва ўсёй сваёй велічні.

Сусьветны крызіс, паводле прызнаньняў самой буржуазіі, усё больш пагыбляецца і пашыраецца і няма надзеі навет на яго зьмякчэньне. Кожны дзень мы маем весткі аб закрыцьці новых фабрык і заводаў, банкрутствах навет старых фірм, аб выкідваньні на вуліцу дзесяткаў — соцень тысяч рабочых. Асаблівую вострасьць эканамічнаму крызісу надае той факт, што ён супаў з крызісам у сельскай гаспадарцы. Крызіс у земляробстве цягнецца ад сусьветнай вайны і носіць хранічны характар. Як зазначае ў органе польскіх эндэкаў «Газэта Варшаўска» ў № 56 адзін з эканамістаў фашыцкай Польшчы Шмідт нядаўна ў сваім дакладзе на сходзе таварыства эканамістаў і статыстыкаў заявіў, што «**зямляробства з часу сусьветнай імпэрыялістычнай вайны бязупынна знаходзіцца ў стане крызісу, які час-ад-часу перарываецца гаспадарчым ажыўленьнем**».

Наколькі востры крызіс перажывае сусьветнае зямляробства, надзвычай яркa сьведчыць хаця-б такі факт, што фэрмэры са Скучувану (Канада) стрымлівалі кожны год ад **223 да 255 млн. даляраў прыбытку**, у 1929 годзе іх даход зьнізіўся **да 104 млн. даляраў**, а ў 1930 г. ён будзе меншы **100 млн. даляраў.**

Індэкс цэн на сельгаспрадукты зьнізіўся **з 192 у 1920 г. да 44 у 1929 г.** Нарэшце, да яроста баечых разьмераў дамаль ва ўсім сьвеце павялічылася **запазычанасьць зямляробства.** Так, паводле даных камітэту экспарту для зямляробчых кредытаў, зямляробчыя даўгі ў **Баўгарыі складаюць зараз 41 млн. даляраў, Эстоніі — 23 млн., Вэнгрыі — 245 млн., Латвіі — 49 млн., Польшчы — 251 млн., Румыніі — 240 млн. і Юга-Славіі — 733 млн. даляраў.** Но здэшч гэтагар ворнай зямлі ў гэтых краінах прыпадае даўгоў: **у Баўгарыі — 11 дал., Эстоніі — 8, Вэнгрыі — 34, Латвіі — 15, Польшчы — 10, Румыніі — 14 і Юга-Славіі — 59 даляраў.**

Расьце гаспадарчы крызіс, павялічваецца развал капіталістычнай сыстэмы, армія беспрацоўных расьце з катастрафічнай шпаркасьцю. Дякуючы актыўнай рабоце сяўных брацкіх кампартый, па ўсім сьвеце павялічваецца сьвядомасьць ды арганізаванасьць працоўных мас. Адначасова з гэтым узмацняецца і рэвалюцыйны рух. Няма зараз ні аднаго дня, каб за ўсёй капіталістычных краінах не адбывалися бурныя дэманстрацыі беспрацоўных і працоўных рабочых. Мы зараз стаім перад фактам сустрэчных клясавых баёў ва ўсім сьвеце, якія ўсё больш узмацняюцца, набываюць упарты і жорсткі характар. Пры гэтым найбольш актыўным атрадам, пачынальнікам у барацьбе супроць капіталістычнай сыстэмы, у барацьбе супроць сыстэмы галечы, голаду і падрыхтоўкі вайны зьяўляюцца **беспрацоўныя.** Вулічныя дэманстрацыі беспрацоўных носяць зараз палітычны характар, носяць характар актыўнага наступленьня супроць капіталу за «хлеб, працу і ўладу». Ва многіх буржуазных краінах, як фашыцкая Польшча і Нямеччына, **з-за разгрому выступленьняў беспрацоўных пагражае грамадзянская вайна.** Рэвалюцыйная хваля падымаецца ўсё вышэй і вышэй і патрасае самы фундамант капіталістычнага ладу ва ўсім сьвеце.

Надыходзячы міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем — 25-га лютага зьявіцца кансалідацыяй барацьбы працоўных мас супроць капіталу ва ўсім сьвеце, баявым агітпрапам рэвалюцыйных сіл для канчатковага і рашаючага выступленьня ізад кіраўніцтвам кампартый супроць капіталістычнага ладу, супроць эксплёатацыі, галечы, голаду, за ўладу саветаў па ўсім сьвеце.

Характэрнай асаблівасьцю для сучаснага рэвалюцыйнага руху зьяўляецца той факт, што **ўздым яго адбываецца адначасова ва ўсім сьвеце** — і ў Эўропе, і ў Амэрыцы, — у метраполіях і ў калёніяльных краінах. Зараз таго, што было, напрыклад, у 1923 годзе, калі быў **ўздым рэвалюцыйнай хвалі ў Эўропе**, а мяўчалі калёніі, або калі ў 1926-27 г. г. сусьветная буржуазія рукамі кітайскай рэакцыі граміла кітайскую рэвалюцыю, а пралетарыят Захаду мог толькі заяўляць пратэст, — зараз справа стаіць інакш. **Магутная рэвалюцыйная хваля ў Эўропе, магутная хваля рэвалюцыйнага руху ў Кітаі, Індыі і іншых калёніях і адначасова бурныя посьпехі савецкай пяцігодкі** — вось тры **магутныя рэвалюцыйныя патокі, якія адначасова б'юць у адно месца, у асновы загніваючага капіталізму.**

Капітал шукае выхаду з крызісу, шукае выратаваньня ад загніваючай яго рэвалюцыйнай хвалі. Імпэрыялістычныя драпежнікі свой погляд накіроўваюць на Ўсход, у бок Савецкага Саюзу. За кошт яго яны думаюць выратаваць капіталістычную сыстэму, выратаваць усё свае дабалелыя праблемы.

Адсюль уся тая дзікая антысавецкая сьвістапляска, патокі хлусьні і лекгенд аб Савецкім Саюзе, якія над лёзунгамі або ратаваньня Куцепава, ці ратаваньня самога госпада бога, «савецкага дэмпінгу», «прымусовай працы» на лесазагатоўках у нашым Саюзе, — увесь час вядуцца супроць СССР. Пад эгідаю гэтых легенд і баек сусьветны імпэрыялізм вядзе шыхаманкавую падрыхтоўку да эканамічнай блёкады СССР, да ўзброенага нападу на пралетарскую дзяржаву.

У такой міжнароднай сітуацыі працоўныя Савецкага Саюзу сьвяткуюць 15-ю гадавіну сваёй слаўнай Чырвонай армі — зміцніці Кастрычніка. «Пагроза нападу ўсё больш і выразьней навісае над намі» (Варашылаў). Вось чаму 13-я гадавіна навіна праходзіць пад знакам максымуму ўвагі да абароназдольнасьці нашай краіны, узмацненьня магутнасьці Чырвонай армі, пад знакам праверкі баявой падрыхтоўкі нашых радоў. **13-я гадавіна павінна стаць новым рубяжом і адзначыцца новым уздымам энтузіязму і энэргіі як на нашых фабрыках і заводах, так і сярод чырвоных байцоў па выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, па выкананьні пелшай баявой падрыхтоўкі для напежнай сустрэчы сусьветных драпежнікаў, калі яны адважацца працягнуць сваю крывавую лапу, каб перашкодзіць нашаму мірнаму будаўніцтву сацыялізму.**

Кадры ўдарнікаў павінны быць папоўнены новымі тысячамі перадавікоў.

13-я гадавіна Чырвонай армі павінна стаць рубяжом і для новага ўздыму абарончай работы ўсіх нашых пралетарскіх грамадзкіх арганізацый. «Мае думаецца, таварышы, што ў вялікай рабоце па будаўніцтве сацыялізму, у заваёўваньні нас, настаўнікаў, інжынераў, гэтай будовы мы, будуючы марксістамі, людзьмі справы, а не захапленьняў, якія не забываюць аб нашай барацьбе ў цэлым, мы ня маем права сьпячаць з-пад увагі нават на момант пагражаючую нам зброю нападнікаў» (Варашылаў). **Уся грамадзкасьць павінна мабілізавацца на выкананьні абароны. Шэфская работа заводаў і фабрык над вайсковымі часьцямі павінна быць перабудавана. Самапабораніцтва памяж фабрыкамі, заводамі і вайсковымі часьцямі павінна стаць сапраўдным мэтадам умацненьня баявой падрыхтоўкі і ўкараненьня пралетарскага шэфства ў будні армейскай работы. Шэфства павінна мець сваёй задачай умацненьне ваеннай работы і па самым прадпрыемстве, якое шэфствуе.**

Уся савецкая грамадзкасьць не павінна ні на адну хвіліну выпускаць з-пад увагі пытаньні абароны, асабліва зараз, калі мы маем выступленьне адзіным фронтам супроць Савецкага Саюзу ўсёй сусьветнай рэакцыі. Выцьцё цьвёрдалобых усіх масьцей аб «савецкім дэмпінгу» і «прымусовай працы» ня можа прыкрыць сапраўдных намераў імпэрыялістычнай страі. Уся антысавецкая кампанія, пад якімі-б лёзунгамі яна не праводзілася, мае адну мэту — **зрыў савецкай пяцігодкі.** Праф. Вільдэнтард, старшыня ангельскай «лігі барацьбы супроць прасьледваньня і рабскай працы ў СССР», адкрыта заявіў, што **галоўная мэта гэтай антысавецкай лігі — зрыў пяцігодкі**, «якая пагражае ўсяму сьвету».

Эндэцкі-ж орган «Газэта Варшаўска» ў тым-жа нумары піша: «Важным пытаньнем зьяўляецца пытаньне абароны сусьветных рынкаў супроць Расіі, якая, з прычыны калектывізацыі, а ў сувязі з ёю мэханізацыі зямляробства **можа шмат кінуць** сваіх тавараў на рынкі». Жыгёльны страх перад посьпехамі савецкай калектывізацыі, перад посьпехамі савецкай пяцігодкі — вось прычына антысавецкіх кампаній.

Перадышка, прадастаўленая нам гісторыяй, набліжаецца к канцу. Пралетарыят і працоўнае сялянства Савецкага Саюзу павінны штодзённым сваім абавязкам паставіць — вывучэньне пай сковай справы, вывучэньне аўладаньня мэханічнай зброяй, якой усё больш і больш будзе насычацца сучасны бой. «Мы павінны будаваць справу так, каб у падыходзячай ваіне дабіцца перамогі «малой крывёю» і вайну гэту правесьці на тэрыторыі краіны, якая першая падыме супроць нас меч» (Варашылаў).

Сучасная міжнародная абстаноўка патрабуе ад працоўных мас Савецкага Саюзу быць на варце, каб у кожную хвіліну даць рашаючы адпор імпэрыялістам і перамагчы.

С. Ж.

Назву ўдарнага апраўдалі

У новы навучальны год, год рэканструкцыі і аснашчэньня тэхнікай Чырвонай армії на базе індустрыялізацыі краіны **партарганізацыя №-скага ўдарнага палка сустракае 13-ю гадавіну Чырвонай армії ідэалёгічна згуртаваній вакоп генэральнай лініі партыі.** Бальшавіцкімі тэмпамі і мэтадамі работы партарганізацыя палка, вядучы бязлітаснае змаганьне за генэральную лінію партыі, набыла вялікія посьпехі ў справе баявой падрыхтоўкі чырвонаармейцаў на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Вязумоўна, у рабоце былі і шасобныя недахопы. Іх бачыла і адчувала партарганізацыя. Таму апошнія перавыбары бюро партячэек праходзілі пад знакам завяршэньня паваротy тварам да баявой падрыхтоўкі, да тэхнікі, да аўладаньня складанымі формамі вядзеньня бою, за павышэньне дысцыпліны, за беражлівыя адносіны да зброі.

У радзе ячэек кіруючы склад быў абноўлен. Пасьля перавыбараў **ажывілася работа сэктараў**, асабліва сэктару партасьветы, баявога і ваенкораўскага. Партарганізацыя панесла руйнуючы ўдар па праяўленьнях правааппартуністычнай практыкі, па апартуністычнай стаўцы на самацёк. Анапартуністычная практыка была праяўлена з боку кіраўніцтва ячэйкі 8-ай роты, гаспадарчай і інш. У гэтых падразьдзяленьнях кіраўніцтва парт'ячэек ня здолела скарыстаць актыўнасьці мас чырвонаармейцаў, сваю бязьдзейнасьць прабавала прыкрыць «аб'ектыўнымі прычынамі». У рэзультаце апартуністычнай практыкі ў памянёных падразьдзяленьнях імелі месца бескаспадарчасьць, антысэміцкія вылазкі і інш. недапушчальныя зьявішчы.

Партбюро палка разам з усёй партарганізацыяй бязьлітасна ўдарыла па апартуністычным кіраўніцтве 8-ай і гаспадарчай рот, ужыла арганізацыйныя меры ў адносінах асобных былых кіраўнікоў і практычна аказала дапамогу гэтым партыйным ячэйкам у ліквідацыі прарываў.

Намаганьнямі партарганізацыі і начскладу палка праз мабілізацыю шырокіх мас чырвонаармейцаў вакол асноўных палітычных задач у палку ліквідаваны такія зьявішчы, як самавольныя адлучкі, нядбайныя адносіны да зброі і г. д. Зараз кожны баец разуме, што дрэнна вычышчаная вінтоўка кладзе ганебную пляму на ўсю вайсковую часьць.

Партарганізацыя ўзяла курс на новы тып байца — ударніка. Аднак, трэба падкрэсьліць, што яшчэ не ва ўсіх падразьдзяленьнях умеюць скарыстаць актыўнасьць ударніка, яшчэ ня ўсюды і ня ўсе зразумелі яго ролю. Іменна ў сувязі з гэтым у асобных падразьдзяленьнях наглядалася імкненьне на ўсе 100 процантаў уцягнуць чырвонаармейцаў ва ўдарныя брыгады, не дабіваючыся якасьці работы ўдарніка.

Партарганізацыя вядзе напружаную работу і змаганьне за высокую якасьць работы сярод ударнікаў, за ачыстку ударніцкіх радоў ад лжэ-ўдарнікаў. Партарганізацыя змагаецца за сапраўднае давядзеньне плану баявой і палітычнай падрыхтоўкі да кожнага байца.

50-годзьдзе з дня нараджэньня правадыра Чырвонай армії тав. Варашылава ў палку адзначана новай хваляй энтузіязму чырвонаармейцаў і начскладу. У масах нарадзілася думка аб тым, каб полк дабіўся прысваеньня сабе назвы **імя Кліма Варашылава.** Партарганізацыя неадкладна прыступіла да рэалізацыі гэтай думкі, узялася за работу і дабіваецца, каб полк па-варашылаўску змагаўся за ўзмацненьне баявой падрыхтоўкі, каб полк стаў узорным. І на сёньняшні дзень полк мае пэўныя падставы для таго, каб хадайнічаць аб наданьні яму назвы імя Варашылава. Партарганізацыя маналітна згуртавана вакол генэральнай лініі партыі, вядзе бязьлітаснае змаганьне супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» загібаў і праяўленьняў беспрынцыпнага прымірэньцтва да ўхілаў ад бальшавізму.

Чырвонаармейская маса цесна згуртавана вакол партарганізацыі палка, палітыка-маральны стан масы надзвычай навысіўся. У ленінскіх дні ў партыю ўступіла каля 40 чал., байцы запісваюцца ў калтасы, сьвядома адносяцца да сваіх абавязкаў. Аб гэтым асабліва выразна сьведчыць тое, што дысцыплінарныя спагнаньні нябывала зьнізіліся, асабліва ў напрамку нясеньня гарнізоннай службы, за што ёсьць каля 70 заахвочваньняў як ад начальніка гарнізону, так і ад камандаваньня палка. Полк узмацніў сувязь з рабочымі арганізацыямі, якія над намі шэфствуюць, а таксама і з падшэфнымі калгасамі (выезд брыгад, эстафэта, дапамога рабочай сілай, арганізацыя ўдарных брыгад і г. д.). Усё гэта дало права партарганізацыі і камандаваньню палка паслаць лыжную каманду ў складзе разьдзелу, з рапартам і хадайніцтвам у РВС БВА аб прысваеньні палку назвы імя Кліма Варашылава. Камандзе дана заданьне ад ударнага палка: маршрут Менск — Смаленск — Менск працыцці за 13 дзён.

№-скі полк, пад кіраўніцтвам моцнай партарганізацыі і начскладу назву ўдарнага апраўдаў. Няма ніякага сумненьня ў тым, што полк і ў далейшым будзе па-баявому ўмацоўваць магутнасьць Чырвонай армії.

Д. Б.

Бальшавіцкая работа партарганізацыі —зарука баявой магутнасьці

№-СКІ ЦЕРСКІ ЎДАРНЫ ПОЛК №-скай Самарскай дывізіі імя ангельскага пралетарыяту з тымі задачамі, якія перад ім былі пастаўлены партыяй і Рэвваенсаветам па баявой падрыхтоўцы да 13-ай гадавіны РСЧА, справіўся. Кантрольныя лічбы баявой падрыхтоўкі перавышаны. Байцы і начсклад палка на ўсе 100 процантаў ахоплены індывідуальным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Конная і стрэлковая падрыхтоўка ў параўнаньні з мінулым годам значна павышана. Кулямётчыкі палка на гарнізонным спаборніцтва па стрэльбе са станковага кулямёта з пераходам на лыжах ЗАНЯЛІ ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў ГАРНІЗОНЕ.

Усе гэтыя вялікія посьпехі набыты толькі таму, што партыйная арганізацыя і камандаваньне палка няўхільна мабілізавалі масы чырвонаармейцаў вакоп задач баявой падрыхтоўкі. Партарганізацыя палка ва ўсёй сваёй рабоце вяла бязьлітаснае змаганьне супроць усялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі і ў першую чаргу супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе.

Партыйная арганізацыя палка да 13-ай гадавіны Чырвонай армії значна выраслa. Партыйна - камсамольская праслойка раўняецца 48 проц. Ленінскія дні і 50-гадовы юбілей тав. Варашылава прайшлі ў палку пад пёзунгамі: «тварам да тэхнікі», «за бальшавіцкія тэмпы ў вучобе». Лепшыя ўдарнікі палка ў колькасьці 67 чал. падалі заявы аб уступленьні ў партыю і 74 — у камсамол.

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі, пад кіраўніцтвам правадыра Чырвонай армії, тав. Варашылава Церскі полк будзе няўхільна павышаць сваю баявую магутнасьць і гэтым самым узьнімаць на вышэйшую ступень абароназдольнасьць краіны Саветаў, якая з посьпехам змагаецца пад кіраўніцтвам УсеКП(б) за пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі.

Ваенкор ЖМУРОЎ.

Паказальнікі нашых посьпехаў

У АСОБНЫМ ЭСКАДРОНЕ СУВЯЗІ №-га КАВАЛЕРЫЙСКАГА КОРПУСУ, ДЗЯКУЮЧЫ ПРАВІЛЬНАМУ КІРАЎНІЦТВУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І КАМАНДВАНЬНЯ, САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА АХАПІЛА ЎСЮ МАСУ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.

МАЛАДЫЯ ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ 2-га РАЗЬДЗЕЛУ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗАМЕСТ 60 СЛОЎ У ГАДЗІНУ АБМЕНУ ТЭЛЕГРАМАМІ ДАЦЬ 70 СЛОЎ ПРЫ АБАВЯЗКОВЫМ ЗАХАВАНЬНІ ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦІ. ДА КАНЦА МЕСЯЦА ГЭТЫ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАН, А НАВАТ ПЕРАВЫКАНАН. ЗАРАЗ ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ ДАЮЦЬ У СЯРЭДНІМ 130 СЛОЎ У ГАДЗІНУ АБМЕНУ. СТАРЫМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМ КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА ВЫЗНАЧАНА Ў 180 СЛОЎ У ГАДЗІНУ АБМЕНУ, А ЯНЫ ДАЮЦЬ 200-250 СЛОЎ.

ДЛЯ ТАГО, КАБ АБСТАЛЯВАЦЬ ТЭЛЕГРАФНУЮ СТАНЦЫЮ, ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ ПАТРАБУЕЦЦА 25 ХВІЛІН, А ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ АБСТАЛЕЎВАЮЦЬ ЯЕ ЗА 5-13 ХВІЛІН.

І. К.

МЕЧ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

23 лютага 1918 г. Саветам Народных Камісараў РСФСР быў выдан дэкрэт: «Арганізаваць новую армію пад назвай Рабоча - Сялянская Чырвоная армія.»

Вельмі кароткі дакумант, які складаецца з двух дзесяткаў радкоў, вашпацію у сабе факт **сусьветна-гістарычнага значэньня:** упяршыню ў летапісе чалавецтва пад баявымі сьцягамі РКП(б) парадзілася **арганізаваная ў стройнай сыстэме ўзброеная апора пралетарскай рэвалюцыі, упяршыню рэгулярная армія** гэтага мячом у руках прыпечаная да гэтага часу клясы. Грозныя словы «Чырвоная армія» сымбалізавалі ваенную магутнасьць тых, хто, скінуўшы з сябе вераўсе іга нявольніцтва, выступіў на вызваленьне працоўных усяго сьвету.

Нарадзіўшыся ў агні грамадзянскай вайны, прасіўшуны цяжкі, але непераможны шлях жорсткіх сутыкаў з расійскай буржуазіяй і міжнародным капіталізмам, Чырвоная армія сталёвым коласам, узброеным ідэямі ленінізму, апраўтым у броню сучаснай тэхнікі, стаіць на граніцах двух сьветаў абараняючы краіну, у якой будуецца сацыялізм.

Гаварыць аб гісторыі Чырвонай армії —значыцца гаварыць аб гісторыі рэвалюцыйнага змаганьня міжнароднага пралетарыяту наогул, гісторыі партыі, аб гісторыі рэвалюцыйнага руху рабочай клясы Расіі, у прыватнасьці. **Пытаньне аб узброеных сілах пралетарскай рэвалюцыі — неадлучная частка праграмы і стратэгіі бальшавізму.** Кароткі разьвіцьцё ваеннай арганізацыі рабочай клясы непарыўна зьвязаны з зарадзжэньнем і разьвіцьцём не рэвалюцыйнага змаганьня, над непасрэдным кіраўніцтвам партыі.

Наша партыя зьяўляецца **баявой палітычнай** арганізацыяй пралетарыяту. Іменна гэты баявы рэвалюцыйны характар складае адрозьніваючую рысу бальшавізму з самых першых момантаў яго зарадзжэньня. Адсюль зусім зразумела і натуральна тая вялізная увага, якую аддавала заўсёды партыя бальшавікоў пытаньням узброенага паўстаньня, пытаньням стварэньня вайсковай арганізацыі рабочай клясы.

«Прычынаная класа, якая ня імкнецца да таго, каб навучыцца ўладаць зброяй, мець зброю, заслугоўвала-б толькі таго, каб з ёю абыходзіліся як з нявольнікамі. Ня можам-жа мы, не ператвараючыся ў буржуазных пацыфістаў ці анархістаў, забыць, што мы жывем у клясавай грамадзе і што з яе няма і быць ня можа іншага выхаду, акрамя клясавага змаганьня і зьвяржэньня ўлады пануючай клясы». Так ставіў пытаньне Ленін.

У прапізагу рэфармісцкім вучаньням аб мірным пераходзе ўлады на сьцягах бальшавізму заўсёды былі напісаны пёзунгі накапленьня сіл пралетарыяту, яго баявой арганізацыі для клясавых баёў.

Разьвіцьцё рэвалюцыйнай барацьбы рабочай клясы, падрыхтоўка ўзброеных сіл рэвалюцыі на ўсім працягу прасякнута **кіруючай роляй партыі.**

Надзвычай важна падкрэсьліць, што пытаньне аб узброеным паўстаньні заўсёды ставілася бальшавікамі **рэвалюцыйна-дыялектычна**, на класавае самакрытычай абстаноўкі і задач руху на даным этапе. Абараняючы індывідуальны тэрор, як сродак зьвяржэньня самаўладзтва, лічачы масавае ўзброенае паўстаньне няўхільнай і вышэйшай формай рэвалюцыйнага змаганьня, бальшавіцкая партыя па-розному падыходзіць да практычнага ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу ў розныя перыяды часу.

Ленін высоўваў тры ўмовы, наяўнасьць якіх неабходна для посьпеху паўстаньня. «Паўстаньне, каб мець посьпех, павінна апірацца не на змову, не на партыю, а на перадавую клясу. Гэта па-першае. Паўстаньне павінна апірацца на рэвалюцыйны ўздым народу. Гэта па-другое. Паўстаньне павінна апірацца на такі пераломны пункт гісторыі ў нарастаючай рэвалюцыі, калі актыўнасьць перадавых галоў народу найбольшая, калі ўсяго мацней хістальні ў радах ворага і ў радах слабых нерашучых прыхільнікаў рэвалюцыі. Гэта па-трэцяе».

У залежнасьці ад канкрэтнай абстаноўкі Ленін па-розному ставіў пытаньне аб непасрэдным узброеным паўстаньні.

1897 год — «пярэдзіць цэйер пытаньне, да якіх сродкаў зьвернецца сацыял-дэмакратыя для непасрэднага зьвяржэньня самаўладзтва, ці абяро яна паўстаньне, ці шырокую палітычную сутычку (страйк), ці іншы прыём дзеяньня — было-б падобна на тое, калі-б генэралы, не сабраўшы армії, зрабілі вайсковую раду».

1902 год—«перад намі ясна высунут ужо лёзунг падрыхтоўкі паўстаньня, але няма яшчэ заклику да паўстаньня».

1905 год — «апрэмя агульна-палітычнай падрыхтоўкі паўстаньня, высоўгаецца ўрэшце лёзунг — у той-жа час арганізаванага і ўзброенага для паўстаньня, стварэньне баявых групы, бо рух ужо прыйшоў да неабходнасьці ўзброенага паўстаньня».

Які-ж шлях прайшла рабочая класа і яе партыя ў справе стварэньня і падрыхтоўкі ўзброеных сіл пралетарскай рэвалюцыі? Якія галоўнейшыя этапы гэтага разьвіцьця, пачынаючы ад зары рэвалюцыйнага руху ў Расіі, да сучаснага моманту?

Дэкларыруючыя праграмныя патрабаваньні РСДРП у ваенным пытаньні зьвяліся ў **гамане стала** ваенна ўсенагульным узброеным народу», што мела тое-ж гістарычнае значэньне, што і іншыя патрабаваньні дэмакратыі: усенагульнага выбарчага права, адзінапалатнай сыстэмы і інш.

Формы «ваенай арганізацыі» бальшавікоў упяршыню праяўлены ў рэвалюцыю 1905 году—першай сур'ёзнай схватцы Расіі з самаўладзтвам.

Бальшавіцкая партыя адразу ж становіцца на чале барацьбы рабочае клясы з сялянства, старацца ўнесьці ў іх рады арганізаванасьць, запаліць іх рэвалюцыйным энтузіязмам.

Трэці зьезд партыі дае лёзунг падрыхтоўкі да непасрэднага ўзброенага паўстаньня: «Прыняць самыя энэргічныя меры да ўзбраеньня пралетарыяту, а таксама да выбраеньні пляну ўзброенага паўстаньня і непасрэднага кіраўніцтва ім, стварэньні для гэтага, на жэрні магчымасьці, асобых групы з партыйных работнікаў».

Вельмі характэрна, што Жолтаўская канферэнцыя мензавікоў, якая адбывалася адначасова з 3-м зьездам, адмовілася ад усякіх тэхнічных спосабаў падрыхтоўкі паўстаньня і работы сярод войск.

У выкананьне дырэктыў 3-га зьезду, бальшавікі разьвілі кіпучую дзейнасьць **ПА РАЗЛАЖЭНЬНІ ЦАРСКАЙ АРМІІ І ПА СТВАРЭНЬНІ БАЯВЫХ РАБОЧЫХ ДРУЖЫН.**

Уплыў бальшавікоў на многіх вайсковых часьцях быў вельмі моцны. Асабліва пасьпяхова працякала работа ва флёце, дзе быў вялікі процант рабочых.

На фабрыках і заводах ствараюцца баявыя дружыны з рабочых. Ужываюцца ўсе меры, каб здабыць магчыма больш зброі. Растуць барыкады на вуліцах. У Маскве, Пецеры, на Украіне, на Паўказе, у Данбасе і іншых месцах выбухаюць узброеныя паўстаньні рабочых. Бальшавікі стаяць на чале і змагаюцца ў першых радох пралетарыяту. Барацьба дасягае найвышэйшага напружаньня ў момант узброенага сыпжальскага паўстаньня. 12 дзён цягнулася тут вулічная барацьба на барыкадах. Баявыя дружыны, пад кіраўніцтвам бальшавікоў, паказалі сапраўдныя цуды адвагі і гэраізму, біліся супроць царскіх салдат, якія ў дзесяткі раз перавышалі іх колькасьцю.

Рэвалюцыя 1905 году была царызмам задушана. Але яна стала рэпэтыцыяй пераможнага Кастрычніка іменна таму, што бальшавікі на ходзе падзей 1905 г. **выпрабавалі сваю тактыку ўзброенага паўстаньня,** што ў ім бальшавікі выкавалі **арганізацыйныя формы** ўзброенага змаганьня пралетарыяту і баявых дружыны. Яны зьявіліся пачатковай формай вайсковай арганізацыі пралетарыяту, першымі атрадамі будучай Чырвонай армії. У абліччы баявых дружын бальшавіцкая партыя паказала пралетарыяту першую форму ўзброенай арганізацыі — прадобраз Чырвонай армії. Пралетарыят набыў баявы вопыт барыкаднай тактыкі.

Ленін і ўся партыя бальшавікоў надавала вялізнае значэньне ўзброенаму паўстаньню 1905 году, і калі меншавікі свае адносіны да яго (паўстаньня) пралівалі ў характэрнай фразе Пляханава: «Ня трэба было брацца за зброю», то бальшавікі ўважліва вывучалі вопыт першай рэвалюцыі, ставячы задачу далейшага накапленьня сіл пралетарыяту для рэвалюцыйнай барацьбы. На 4-м зьезде партыі бальшавікі ставілі пытаньне так: «Трэба разьвіць яшчэ больш энэргічную дзейнасьць па павялічэньні баявых дружын, палянішэньні арганізацыі і забесьпячэньні іх усякага роду зброяй. Неабходна пашырыць работу сярод войска. Напіраваць сілы на аб'яднаную дзейнасьць рабочых і сялян для арганізацыі на магчымасьці сумесных і адначасовых баявых выступленьняў».

На вопыце рэвалюцыі 1905 году бальшавікі праверыў і загартаваў сваю тактыку, выказаў асноўныя прыпынты ўзброеных сіл рэвалюцыі. Гэтыя прынцыпы партыя пранесла праз усю чорную палясу рэакцыі, да новага ўздыму рэвалюцыйнага руху. Сьледуючы вучэньню марксізму, улічваючы канкрэтныя абставіны, якія стварыліся пасьля рэвалюцыі 1905 году, 5-ты зьезд партыі прызнаў, што «ў сучасны момант, пры адсутнасьці ўмоў для масавага ўзарыву, партызанскія выступленьні непажаданы». Адначасова зьезд падкрэсьліў неабходнасьць **ПАДРЫХТОЎКІ І НАКАПЛЕНЬНЯ ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ ПРАЛЕТАРЫЯТУ** для будучых баёў. «Формай баявых арганізацый, якая найбольш адпавядае задачы падрыхтоўкі баявога авангарду пралетарыяту да ўзброенага паўстаньня, зьяўляецца сыстэма партыйнай міліцыі, якая заключаецца ў навучаньні вайсковай справе ўсіх членаў партыі, у рамках існуючых партыйных ячэек» і далей: «Узмацніць арганізацыйную і агітацыйную работу ў арміі».

Усерасійская канферэнцыя РСДРП, якая была ў 1907 годзе, зазначае, што «на парадак дня высоўваецца раней за ўсё працяжная работа выхаваньня, арганізацыі і згуртаваньня сьвядомых мас пралетарыяту».

Такім чынам мы бачым, што бальшавіцкая партыя і ў перыяд рэакцыі ні на крок не адступіла ад ролі правадыра пралетарыяту, падрыхтоўваючы сілы для будучага ўзброенага паўстаньня.

Сусьветная вайна паставіла партыю перад цяжэйшымі задачамі, патрабавала новай тактыкі, новых лёзунгаў. Сваю работу партыя правядзіць пад генэральнымі лёзунгамі: «Вайна вайне». «Ператварэньне імпэрыялістычнай вайны ў грамадзянскую». Гэтыя

ЗАВОД, САУГАС І КАЛГАС — НЕПАХІСНАЯ КРЭПАСЬЦЬ САЦЫЯЛІЗМУ

Аснова абароназдольнасьці Савецкага Саюзу — у індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі

НАРОДЖАНАЯ Ў БАЁХ ЗА ПЕРАМОГУ КАСТРЫЧНІКА ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НЕПАХІСНЫ ВАРТАВЫ ГРАНІЦ СССР І ЯГО САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ НА АСНОВЕ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ ЗА 4 ГАДЫ

Дзесяты Усебеларускі зьезд саветаў

15 МЕСЯЦАЎ сацыялістычнай будоўлі

Рапарт чырвонаармейскай камуны імя БВА

13-ю гадавіну рабоча-сялянскай Чырвонай армі ЧЛЕНЫ КАМУНЫ ІМЯ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ АКРУГІ сустракаюць вялізарнейшымі перамогамі на фронце барацьбы за сацыялістычную гаспадарку.

Гэтыя перамогі выпукляюцца асабліва ярка на фоне тых выключных труднасьцяй, якія спаткалі былыя 115 байцоў дзьвёх № дывізій, калі ўвосень 1929 году прышлі на дзікае папескае балота будаваць буйную капектыўную гаспадарку.

Адсутнасьць дарог, яшчэ ня зусім асушанае балота і ў сувязі з гэтым суровыя прыродныя ўмовы стваралі цяжкія ўмовы для работы. Павсобныя малаверы, трусы і гультаі ўцякілі; энтузіясты-ж з цьвёрдай верай у посьпех, з бальшавіцкай упартасьцю змагаліся з труднасьцямі. Мы жылі ў палатках і бараках, працавалі, не шкадуючы сіл і пад кіраўніцтвам партыі пры дапамозе пралетарскай дзяржавы і савецкай грамадзкасьці перамагалі ўсё тое, што тармазіла нашу справу.

15 месяцаў прайшло з таго часу. СЁНЬНЯ Ў 13-ю ГАДАВІНУ РСЧА МЫ МОЖАМ ЦЬВЁРДА І З ЎПЭЎНЕНАСЬЦЮ ЗАЯВІЦЬ, ШТО З ПОСЬПЕХАМ СПРАЎЛЯЕМСЯ З АДКАЗНЫМІ ЗАДАЧАМІ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ ПЕРАД НАМІ ПАРТЫЯЙ. ФУНДАМАНТ БУЙНОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ НА БАЛОЦЕ НАМІ ЗАКЛАДЗЕН.

На былых балотах і пустырох пабудаваны 6 вялізарных жылых дамоў, школа, амбулаторыя, пазьня, прапьня сталоўка, сьвіран, вялікі хлеў на 400 штук буйной рогатай жывёлы, сьвінарнік на 200 сьвіней, цялятнік і рад іншых будынкаў.

Намі пабудован і пушчан паравы млын, пры якім абсталяваны дзьве крупадзёрні, сушнарка і алейня.

Намі таксама пабудован лесапільны завод, цагельня, якая ў наступным годзе дасьць каля 1 мільёна цэглы.

Мы ўжо дасягнулі вялікіх посьпехаў у арганізацыі жывёлагадоўчай гаспадаркі. Камуна мае 429 штук буйной рогатай жывёлы, 100 сьвіней, 127 авец, 74 цялят, 69 коняй.

Камуна будуе сваю гаспадарку на аснове машынай тэхнікі. Яна мае ўласных 5 трактараў (ня лічачы 15 трактараў МТС), два грузавікі і рад сельска-гаспадарчых машын. Абсталявана рамонтная майстэрня. З БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ ПАДРЫХТАВАНЫ ТРАКТАРЫСТЫ І ШОФЭРЫ. УСЕ КВАТЭРЫ, ХЛЯВЫ, СЬВІНАРНІК І ГАСПАДАРЧЫЯ БУДЫНКІ АСЬВЯТЛЯЮЦЦА ЭЛЕКТРЫЧНАСЬЦЮ. КАМУНА РАДЫЁФІКАВАНА.

Два месяцы назад мы распачалі падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Камунары высунулі сустрэчны плян, якім абавязаліся пашырыць плошчу пасеваў да 1.200 гэкт. замест 1.075 гэкт., прадугледжаных заданьнем. Замест некалькіх гэктараў у мінулым годзе мы сёлета будзем сеяць пад канаплі 200 гэкт.

Плян даведзен да кожнага камунара. Уся пасеўная плошча разьбіта на 5 вучасткаў. Да кожнага вучастку прымацавана спэцыяльная брыгада.

Ужо скончан рамонт трактараў, капёс і с.-г. інвэнтару.

На сёньняшні дзень камуна яшчэ не атрымала ні аднаго вагона калійных угнаеньняў. Мы патрабуем прыняцьця рашучых мер да своячасовага іх завозу, бо даставіць іх у камуну трэба на працягу бліжэйшых тыдняў пакуль існуе санная дарога. Неабходна памятаць, што зрыў завозу калійных угнаеньняў — гэта зрыў плану сэўбы капапель у першую чаргу.

Камуна ўжо на практыцы даказала навукольнаму сялянству усе вялізарныя перавагі калектыўнай гаспадаркі. КАМУНА ВЯДЗЕ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ МАСАВУЮ РАБОТУ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ ЗА КАЛГАС. ВЫНІКАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ КАМУНАРАЎ ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ КАЛГАСНАГА РУХУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АРГАНІЗАЦЫЯ 5 БУЙНЫХ КАЛГАСАЎ У ВАКОЛІЧНЫХ ВЁСКАХ І СЕЛЬСАВЕТАХ. ПА ПРОСЬБЕ НОВЫХ КАЛГАСАЎ, КАМУНА ВЫЛУЧЫЛА Ў ЯКАСЬЦІ ІХ СТАРШЫНЬ СВАІХ ЛЕПШЫХ КАМУНАРАЎ.

За апошнія два месяцы ў сувязі з ударнай падрыхтоўкай да сяўбы ў нашу камуну ўступіла 38 новых членаў. Вялікая хваля прыліву адзначаецца і ў суседніх калгасах, арганізаваных камунай. Толькі ў калгас «Дружба» ўступіла 50 новых бядняцка-серадняцкіх двароў.

МЫ АКАЗВАЕМ ВЯЛІКУЮ ДАПАМОГУ НАЎКОЛЬНЫМ КАЛГАСАМ, АДНААСОБНІКАМ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ. УСЁ ГЭТА ЯШЧЭ БОЛЬШ СПРЫЯЕ РАЗГОРТВАНЬНЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Разьвіваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, упарта змагаючыся з выпадкамі недысцыплінаванасьці, палепшаючы арганізацыю працы (усе работы пераведзены на зьдзельшчыну), мы вядзем барацьбу за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, што зьяўляецца першым адказам на імкненьні імпэрыялістаў сарваць савецкую пяцігодку.

Мы лічым неабходным узмацніць працу па палепшэньні абароназдольнасьці краіны і ўсе станавімся ў рады актыўных членаў Асоавіяхіму. У фонд абароны перадаем 634 руб., якія даў арганізаваны намі спэцыяльны нядзельнік.

У дзень 13-ай гадавіны РСЧА камунары імя БВА кажуць сваё гарачае прывітаньне Чырвонай арміі і заклікаюць усіх байцоў, мацна трымаючы ў руках вінтоўку, пільна сачыць за межамі і ахоўваць будаўніцтва сацыялізму.

Калгасы СССР, разьвіваючы сваю гаспадарку і разгортваючы калектыўны рух, узмацняюць абароназдольнасьць савецкай краіны.

У дзень 13-ай гадавіны РСЧА мы, камунары, абавязваемся па-ўдарнаму правесьці другую бальшавіцкую вясну, змагаючыся за сумленную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва як клясы на гэтай базе.

Па даручэньні камунараў старшыня камуны МОДЗІН.
Сакратар ячэйкі КП(б)Б ЗЕНАЎ.

Ударнікі абароны

РАПАРТУЕМ ДА ДНЯ 13-ай ГАДАВІНЫ ЮБІЛЕЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Па-ленінску выконваючы дырэктывы партыі, калектыў рабочых-ударнікаў «Палесдруку» з посьпехам скончыў другі год пяцігодкі і выканаў ударную праграму асобнага кварталу. Усіх гэтых посьпехаў мы дасягнулі, дзякуючы правільнай ленінскай лініі партыі, пад кіраўніцтвам якое рабочая кляса СССР з посьпехам будуе сацыялізм. У барацьбе з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, супроць правых і «левых» апартуністаў, накіроўваючы галоўны ўдар па правых апартуністах, мы з посьпехам ідзем на шляху далейшага будаўніцтва сацыялізму.

Усе нашы посьпехі ўзмацняюць нянавісьць і шаленства капіталістаў, якія ўсякім чынам імкнуцца справакаваць нас на новую бойню і сарваць сацыялістычнае будаўніцтва.

У гэты час, як ніколі, ад кожнага рабочага патрабуецца яшчэ больш на варце, яшчэ шпарэйш узмацніць абароназдольнасьць нашай краіны СССР — бацькаўшчыны ўсяго пралетарыяту.

Наша ячэйка Асоавіяхіму сапраўды працавала па справу ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны, уцягваючы кожнага рабочага ў рады Асоавіяхіму.

Мы маем наступныя паказальнікі: сабрана шляхам суботнікаў у фонд абароны краіны 803 руб., у фонд дырыжаблябудаўніцтва — 600 руб. Арганізавана баявая стралковая адзінка, якая ахапляе 110 рабочых.

Арганізавана ўдарная брыгада імя Асоавіяхіму.

У дзень юбілею тав. Кліма Варашылава арганізавана ўдарная брыгада імя Кліма Варашылава.

Сувязь з падшэфнай часьцю Чырвонай арміі праводзіцца шляхам узаемнай дапамогі ў рабоце, выездаў рабочых да чырвонаармейцаў.

Мы лічым, што ўсе гэтыя дасягненьні нас яшчэ ня могуць задаволіць. Мы павінны весьці яшчэ больш растлумачальную работу сярод рабочых аб важнасьці работы ячэйкі Асоавіяхіму на прадпрыемстве.

Бліжэйшая баявая задача — учапіць на ўсе 100 проц. рабочых у рады Асоавіяхіму, шырэй разгарнуць сярод рабочых работу па вяжнізацыі.

Няхай мацнее абарона краіны Саветаў!

Пралетарскае прывітаньне Чырвонай арміі і яе правадыру — ленінцу Кліму Варашылаву!

Ні аднаго рабочага на-за радамі Асоавіяхіму!

Рабочы калектыў «Палесдруку».



Пагранічная трывога

Даклад ураду — малюнак нашых перамог

21 лютага

Вечэрняе пасяджэньне адкрыў тав. **Рапапорт.**

Пачынаюцца спрэчкі па справаздачным ураду.

— Гаспадара Сяльцкай Беларусі — 10 зьезд саветаў вітаю ад калгаснікаў 63 калгасаў, бедняку і сераднякоў Горацкага раёну, — гаворыць усхваляваны ад радасьці стары селянін - калгаснік — тав. **Радзько.**

Сівы дзед расказвае дэлегатам зьезду аб сваім дакалгасным цяжкім жыцьці, аб рабоце пастухом у кулакоў.

— На трыбуне малады калгаснік Пухавіцкага раёну — тав. **Арашчук.** Яго прамова часта перарываецца воплескамі.

— Мы на справе даведаем, што можам будаваць буйныя сацыялістычныя гаспадаркі і, на базе суцэльнай калектывізацыі, ліквідуем кулака.

— У некаторай — праўда малой частці бедняты — «жаночае сэрца» (агульны сьмех), яны жаласьліва да кулакоў і таму часам кулакі мала абкладаюцца.

— Ня гледзячы на шкодніцтва, мы пераможна працягваем будаўніцтва нашай сацыялістычнай гаспадаркі, — заяўляе дэлегатка тав. **Касьцюковіч.**

— З вялікай прамовай выступіў новы прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук — тав. **Горын.**

— Мы ня можам сёньня пахваліцца вялікімі дасягненьнямі. Усім відома мінулае ВАН. Ганебная плямa нацдэмаўчыны яшчэ ня змыта.

— Ня гледзячы на гэта нашы посьпехі сапраўды гіганцкія.

— Ад імя новага кіраўніцтва ВАН заяўляю зьезд, што пад кіраўніцтвам ленінскай партыі выканаем задачы, якія стаяць перад Беларускай Акадэміяй Навук.

— Ад другой беларускай чырвонасьцяжнай дывізіі імя Фрунзе баявое чырвонаармейскае прывітаньне зьезду.

У справе баявой падрыхтоўкі і вучобы 2-ая Беларуская мае шмат дасягненьняў.

— На шалёнае цкаваньне нашага Саюзу з боку замежных ворагаў, на спробы інтэрвэнцыі, мы адказваем узмацненьнем баявой падрыхтоўкі.

— **Зброя ў парадку. Порах сухі. У любы момант можам выступіць на абарону нашай краіны.** (Бурная авацыя, крыкі «браво», «ура»).

— Лодзінскія тэкстыльшчыкі, — гаворыць тав. **Аранштам,** — рабочыя Верхняй Сілезіі паміраюць з голаду. Сотні тысяч рабочых Польшчы, сяляне-беднякі і сераднякі Зах. Беларусі і Украіны з надзеяй накіроўваюць свае погляды на Усход.

У гэты час паспяная прамысловасьць Польшчы квінее, яна ня ведае труднасьцяй і крызісаў...

— Наша Чырвоная армія перажывае зараз працэс укараненьня тэхнікі.

— Толькі тэхнічна насычаная армія здолее абараніць нашу пяцігодку.

— Вяжнізацыя працоўнага насельніцтва ў нас разгорнута слаба, асабліва ў калгасах і саўгасах. Шэфства над Чырвонай арміяй пастаўлена нездавальняюча.

— Вітаючы зьезд ад імя ГВС БВА, заклікаю палепшыць шэфства над Чырвонай арміяй, узмацніць вяжнізацыю працоўнага насельніцтва.

— Дэлегацыя калгаснікаў Плешчаніцкага раёну перадае прывітаньне зьезду ад райкалгасзьезду.

Прадстаўнік дэлегацыі — тав. Хадасэвіч рапартуе.

— 2 тысячы сталыпінска - прышчапаўскіх хутароў ператварыліся ў 64 магутныя калгасы, у якіх 10 тысяч калгаснікаў.

Калгасы маюць 4 трактары, розныя с.-г. машыны. Пры калгасах адкрыты 14 дзіцячых ясьлей, сталоўкі, радыё-вузел і т. д.

Заданьне па загатоўках неравыкананa. Рыхтуемся да арганізацыі МТС.

Працоўнае насельніцтва раёну просіць пераймеснаваць Плешчаніцкі раён у раён імя **Мяжыньскага.**

— Для чырвоных партызан, — заяўляе **Зайкоўскі,** — труднасьцяй няма.

На фронце будаўніцтва, у барацьбе за пяцігодку — загартаваныя партызаны на-баявому выкананць адказьнейшыя задачы.

— Тав. **Рапапорт** ад імя прэзыдыуму зьезду адказвае на прывітаньні.

— Мы ня можам забыць заслуг чырвоных партызан.

— На гаспадарчай, прафэсыянальнай і савецкай рабоце яны павінны прадаваць ня горш, чым у 1919 і 1920 гадох.

— Чырвоныя партызаны павінны быць заўсёды гатовы, каб у патрэбны момант на першым закліку партыі і савецкай улады стаць на абарону нашай краіны.

22-га лютага

Ранішняе пасяджэньне зьезду адкрывае тав. **ВЭНДЭ.**

Працягваюцца спрэчкі па справаздачным дакладзе ўраду БССР. Усе вузлавыя пытаньні дакладу т. Галадзеда займаюць шырокае месца ў выступленьнях дэлегатаў.

На ранішнім пасяджэньні пасьпелі выказацца 21 чал.

— Палітычная лінія ўраду была правільнай — заяўляюць дэлегаты з трыбуны зьезду. Ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі партыі, выразным правядзеньнем ленінскай нацыянальнай забясьпечаны посьпехі гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.



Дэлегацыя Н стр. дывізіі вітае X Усебеларускі зьезд

За пяцігодку, за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны дыктатуры пралетарыяту

Нападкі з боку капіталістычнага сьвету на Савецкі Саюз, усякага роду авантуры, гутаркі аб «савецкім дэмпінгу» і інш. абавязваюць нас удзесяцярыць нашу пільнасьць і ўзмацніць ваенную падрыхтоўку, каб быць гатовымі ва ўсякі момант стаць на абарону сваіх пралетарскіх межаў.

На нашай фабрыцы работа Асоавіяхіму за апошні час узмоцнена, перавыбраны цэх'ячэйкі, праведзен збор сродкаў на пабудову дырыжабля ў суме 200 руб., на ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны — 400 руб. Адпрацавалі суботнік 22-ій, што дало 1.300 руб. Дадаткова рэалізавана 350 прэзыгазаў.

МЫ, РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ, У ДЗЕНЬ ЮБІЛЕЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАЕМ СЛОВА, ШТО НАДАЛЕЙ У ШТОДЗЕННАЙ СВАЁЙ РАБОЦЕ БУДЗЕМ ПРЫМАЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎСІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ АСОАВІЯХІМУ І ПАСТАНОЎ ЗЬЕЗДУ Ў СПРАВЕ ДАЛЕЙШАГА УМАЦАВАНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ НАШАЙ КРАІНЫ. УЗМОЦНІМ ЯШЧЭ БОЛЬШ СУВЯЗЬ З ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ ДЛЯ БОЛЬШ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВАЯНІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ І МАЦНЕЕ ВЕРНАЯ АПОРА МІРНАЙ ПРАЦЫ! — АСОАВІЯХІМАЎСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЕРНЫ КІРАЎНІК ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ — ЦК НАШАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!

Калектыў рабочых і служачых гомельскай швэйнай фабрыкі «Камінтэрн».

***

Пад кіраўніцтвам партыі рабочая кляса працоўнае сялянства дабіліся вялізарных посьпехаў на фронце будаўніцтва сацыялізму.

Пасьпяховае наступленьне сацыялістычных элемантаў на ўсім фронце абвяргае прадраканьні правых і «левых» апартуністаў, якія ня верыць у рэальнасьць бальшавіцкіх тэмпаў. Ваенная работа павінна стаць у цэнтры ўсёй грамадзкасьці. Да апошняга месяца на фабрыцы «Праца» не аддавалася досыць увагі ваеннай рабоце.

За апошні час мы маем рэзкі пералом у гэтых адносінах: арганізавана вайсковая адзінка — гурток па ліквідацыі ізмічнай непісьменнасьці. 85 проц. усіх рабочых фабрыкі — члены Асоавіяхіму. Вайсковай літаратуры ёсьць 136 экз. На дырыжабль «Клім Варашылаў» сабрана 892 руб. Суботнік даў на дырыжаблябудаўніцтва 1.553 р.

Гэта зьяўляецца толькі пачаткам работы. Мы прыложым усе намаганьні, каб лепш паставіць работу і з посьпехам не разгортваць.

Сакратар партыкалектыву
КАГАН.

Старшыня фабкому абутковай фабрыкі «ПРАЦА» БЕРАЗОЎСКІ.
Старшыня Асоавіяхіму БАЛОЦІН.

Рабочыя, адміністрацыйна-тэхнічны персанал і служачыя швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн» у колькасьці каля 2.000 чал. рапартуюць перад 13-й гадавінай РСЧА аб дасягненьнях фабрыкі і пэрспэктывах далейшай работы ў 3-м рашаючым годзе 5-цігадовага пляну.

1) У 2-м годзе 5-цігодкі фабрыка «Прафінтэрн» выканала прамфінплян на 102,4 проц., знізіла сабекошт на 8,1 проц., узьняла прадукцыйнасьць працы на 22,9 проц.

2) У асобнай квадры 1930 г. прамфінплян выкананы на 94,1 проц., сабекошт знижан на 4,7 проц.

3) У 3-м годзе швэйная прамысловасьць Віцебшчыны робіць гігантскі крок уперад і, калі ў 1929-30 г. было выпушчана прадукцыі на суму 22 мільёны руб., дык у 1931 г. запраектован выпуск на суму 66 мільёнаў руб., што зьяўляецца зусім рэальным і магчымым для выкананьня пры разгортваньні вытворчасьці пабудаванай гіганцкай новай швэйнай фабрыкі «Сіняг індустрыялізацыі».

4) Швэйная прамысловасьць Віцебшчыны ахопіць у 1931 г. каля 6.000 рабочых сваімі прадпрыемствамі, і гэта даказвае ўсім апартуністам з лягеру правых ухілістаў і «левых» загібшчыкаў, **што генэральная лінія Усесаюзнай камуністычнай партыі на чале з правадыром тав. Сталіным зьяўляецца адзіна правільнай.** Гэтых посьпехаў мы дасягнулі шляхам разгорнутай масавай работы на сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве па ўсіх галінах нашай работы і шляхам шырокай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

5) У часе праведзеных манэўраў мы маем прыток лепшых рабочых-ударнікаў у ленінскую партыю ў колькасьці 62 чалавек. На дырыжабль «Клім Варашылаў» сабрана 1.500 руб. добраахвотных узносаў. У часе «дэкады абароны» сабрана 2.000 руб.

6) Рабочыя швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн» шчыра запэўніваюць, што на падставе дырэктыў Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і КП(б)Б будуць на нашай фабрыцы разгорнуты ў яшчэ большай меры сац. спаборніцтва, а таксама баявая падрыхтоўка да падыходзячых рашучых баёў з усімі капіталістамі, якія рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць Саюзу ССР.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і правадыр яго — тав. Сталін!

Няхай жыве лепшы паплечнік т. Сталіна — правадыр пераможнай Чырвонай арміі і флёту — т. Варашылаў!

Няхай жыве вялікі 5-цігадовы плян, які будзе выкананы за 4 гады, а па асобных галінах — за 3 гады!

Калектыў Асоавіяхіму Віцебскай швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн».



Дом Культуры, дзе адбываецца зьезд

БССР, адсталая ў мінулым краіна, ператвараецца ў краіну індустрыі і сацыялістычнага земляробства. Нашы посьпехі ва ўсіх галінах будаўніцтва — падкрэсьліваюць прамоўцы — нябачныя ў гісторыі чалавецтва. Яны магчымы толькі ў краіне пралетарскай дыктатуры, у краіне будаўніцтва сацыялізму, дзе праца становіцца справай славы, гонару і гэройства.

Падагульваючы вынікі пройдзенага перыяду ад IX да X зьезду, прамоўцы сканцэнтроўваюць увагу на далейшых задачах сацыялістычнага будаўніцтва.

— Забясьпечыць выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі — гаворыць тав. Паталчук — гэта значыць разьвіваць і павышаць тэмпы работы, больш павялічыць клясовую пільнасьць, перабудаваць поўнасьцю работу ўсіх зьвеньняў савецкага апарату ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Між тым, адзначае прамоўца, пасьля піўдзесяці акруг некаторыя цэнтральныя ўстановы не пераключыліся ў сваёй рабоце на справу лепшага кіраўніцтва раёнамі. Жывога кіраўніцтва, у большасьці раёнаў, асабліва тых, якія на далёкай адлегласьці ад чыгункі, не адчуваецца. Работа сельсаветаў не пастаўлена па-баявому, чым у некаторай ступені і тлумачацца яшчэ значныя недахопы і прарывы ў выкананьні гаспадарча-палітычных задач.

Закранаючы гэта пытаньне, у сваім выступленьні тав. Арашчука адзначыў, што кіраўніцтва рэгіямі з боку некаторых наркаматаў фармальнае. Наркамзем праводзіць спэцыялізацыю гаспадаркі, ня ўлічваючы асаблівасьцяй раёнаў. У плянаваньні панує блытаніна. Спэцыялізацыя некаторых саўгасаў мяняецца па тры разы на працягу двух месяцаў.

— Наркамснаб даваў заданьні па загатоўках паасобным раёнам на палову зьменшаныя супроць рэальнай магчымасьці выкананьня, і наадварот, атрыманае намі заданьне па загатоўцы цяпляных скур магчыма было-б выканаць, толькі пры ўмовах, каб усіх цяплят у раёне пастаўіць над ножам і садраць з кожнага па дзьве скуркі.

Гэтыя факты сьведчаць аб адсутнасьці ў рабоце Наркамснабу плянаваньня. У пацьвярджэньне такога становішча тав. Вашкевіч (Бориславіцкі раён) падаў факт, што ў той час, калі ў раёне быў перавыкананы плян збожжазагатовак, (аб чым было вядома ў Наркамснабе), мы атрымліваем тэлеграму: «Ваш раён ня выконае загатовак». Пасьля дасылкі намі паўторных вестак, зноў атрымліваем тэлеграму: «Ваш раён ганебна адстае ў загатоўках».

Асаблівых камэнтараў не патрэбна. Пададзеныя факты яскрава паказваюць на фармальна - бюрократычныя адносіны з боку апарату Наркамснабу да праверкі выкананьня дырэктыў.

Аналёгічныя факты невыстарчальнага кіраўніцтва па лініі паасобных наркаматаў падавалі т. т. Скапаў, Ткачэнка і інш.

Тав. Дубіна — у сваім выступленьні, галоўным чынам, спыняўся на становішчы работы паштовага апарату і сувязі. У сучасны момант праводзіцца тэлефанізацыя 17 раёнаў, якая павінна быць скончана да піценя. У гэтым годзе будуюцца аўтаматычныя тэлефонныя станцыі ў Гомелі, Віцебску і Магілеве.

— Для мэханізацыі пошты набыта 60 аўтамашын. Існуе палітэхнікум па падрыхтоўцы кадраў пошты і сувязі. Наогул-жа работа паштовага апарату і сувязі знаходзіцца ў такім становішчы, якое не задавальняе узросшых патрэб.

Рад таварышоў гаварылі аб ходзе калектывізацыі і падрыхтоўкі да весняной пасеўнай кампаніі. Гэта важнейшая задача — гаворыць таварыш Анішчанка — усьвядомлена на мясцох ня ўсімі савецкімі работнікамі. Падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі разгортваецца вельмі павольна.

— Тэмпы калектывізацыі ў многіх раёнах слабыя. Клясавы вораг — кулак, у сваім супраціўленьні мерапрыемствам партыі і ўлады імкнецца выкарыстаць слабыя месцы нашай работы. Таму павінна быць павялічана клясавая пільнасьць і ўзмоцнена масавая работа ў вёсцы.

Таварышы Позьняк, Кэплан, Вацько і Шэхтман гаварылі аб тым энтузіязьме і творчай ініцыятыве рабочых, якая разгортваецца ў змаганьні за прамфінплян, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Прамоўцы завастралі ўвагу на задачах выкананьня прамфінплану, асабліва па якасных паказальніках.

— У адказ на падрыхтоўку капіталістычных дзяржаў да нападу на Савецкі Саюз — гаворыць т. Шэхтман — рабочыя нашай фабрыкі («Чырвоны Кастрычнік», Мазыр) павялічваюць прадукцыйнасьць працы, зьбіраюць сродкі ў фонд абароны.

Тав. Шэхтман тут-жа, пад гучныя воплескі дэлегатаў, уносіць пяць рублёў на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў».

— Два гады, — гаворыць т. Аляксеенка — я працаваў над арганізацыяй калгасу. Упартай работай, скапаціўшы спачатку ядро з чатырох чал., мы дабіліся да восені арганізацыі калгасу з 14-ці бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Зараз у калгасе налічваецца 24 сям'і.

— Кулакі і заможнікі перашкаджалі нашай рабоце, яны імкнуліся ў сваім павуціньні заблытаць беднату і сераднякоў.

— Асобныя члены нашага савету папалі ў палон кулацкай агітацыі.

Але настойлівай работай 7-мі камсамольцаў, разам з беспартыйнымі актывістамі, мы, акрамя свайго, арганізавалі яшчэ два калгасы.

Даклад ураду — наша тав. ВАЛЬФСОН — яркі малюнак нашых перамог.

— Шкоднікі з «прампартыі», беларускія «рамзнятыя», контр-разлаўцыйныя нацдэмы — уся гэта зграя на грунце адзінай, клясава-варожай пралетарыяту асновае, змыкалася для барацьбы з савецкай уладай за рэстаўрацыю капіталізму. Максім Горкі вельмі ўдала выразіўся, гаворачы: «КАЛІ ВОРАГ НЕ ЗДАЕЦЦА, ЯГО ЗЬНІШЧАЮЦЬ».

— Так, а ня інакш мы паступалі і будзем паступаць са шкоднікімі, контрэвалюцыйнымі элемэнтамі.

— З усёй рашучасьцю, рубам трэба паставіць пытаньне перад асобнымі людзьмі з навуковых і асьветніцкіх працаўнікоў, якія да сёньняшняга дня лічаць сябе «пёяльнымі».

— Нэйтралітэту быць ня можа. Быць нэйтральным, гэта значыць быць супроць нас.

Тав. ШЫЛАК перадае прывітаньне зьезду ад калгасу імя тав. Будзённага.

— Мы, можна сказаць, — гаворыць тав. Шылак — за адзін год вырасьлі ва ўсіх адносінах на 100 проц. Так, пры арганізацыі калгасу у нас мелася 12 шт. рагатай жывёлы, зараз мы маем 60.

— Калгас перажыў шмат труднасьцяй. Але хіба труднасьці нас спыняць?

— Я, — кажа тав. Шылак, — працаваў 48 год батраком і зараз пераканаўся, што адзінае выйсьце з беднасьці, гэта — калгас.

— Толькі праз буйную сацыялістычную гаспадарку можна вырашыць такія важнейшыя праблемы, як жывёлагадоўля.

Тав. МАТУСЭВІЧ расказвае аб становішчы калгаснага будаўніцтва ў Койданаўскім раёне.

Калгасьніца, дэлегатка зьезду

— У 1928 годзе «Правда» пісала, што ў Нарэйкаўскім сельсавеце нашага раёну ня ведаюць што такое савецкая ўлада. На сёньняшні дзень гэты савет заканчвае суцэльную калектывізацыю.

— Такія, сапраўды гістарычныя зрухі, магчымы толькі пры дыктатуры пралетарыяту.

У сваёй прамове тав. МАТУСЭВІЧ асаблівую увагу аддае рабоце пошты.

Тав. АНОЦКІ, а за ім САПРЫЦКІ, спыняюцца на пытаньнях работы сельсаветаў і перабудовы сыстэмы кіраўніцтва.

— Не адзінкавыя яшчэ такія саветы, — кажа тав. Аноцкі, — што займаюцца чым хочаш, толькі не калектывізацыяй.

— У кіраўніцтве цэнтральных устаноў раёнамі, — гаворыць тав. Сапрыцкі, — шмат дробнай апекі. Чаго, да прыкладу, варты збежнік НКЗБ усім загатчыкам райза аб тым, каб апошнія прынялі ўдзел у перавыбарах саветаў. Гэта не анэкдот.

— Нас кожны дзень закідваюць безьліччу стандартнага тыпу, часамі бескарысных, тэлеграм.

З вялікай прамовай выступіў тав. БАЛЦІН.

Шырока высьветліўшы становішча заготовак па БССР тав. Балцін падае цэлую нізку фактаў, якія красамоўна гавораць аб тым, што галоўнай прычынай недавыкананьня загатовак зьяўляюцца не аб'ектыўныя прычыны, як гэта імкнуцца давесьці некаторыя арганізацыі, а наяўнасьць у радзе месц апартуністычнай практыкі.

— Большасьць раёнаў давялі заданьне да кулацка-заможнага двара толькі на адзін процант. Пры чым выкананьне гэтага заданьня зусім нязначнае. Так па БЫХАЎСКІМ, ВЕТРЫНСКІМ раёнах заданьне выканана кулаком па ільне ўсяго на адну чвэртку.

— Такое становішча характэрна ня толькі для гэтых двух раёнаў.

— Калі мы будзем працаваць такімі тэмпамі як зараз, дык для выкананьня пляну загатовак па збожжы патрабуецца яшчэ 15 пяцідневак, а па ільне 60 пяцідневак.

— Характэрна, што з загатоўкамі справа стаіць горш у тых раёнах, дзе адзначана наяўнасьць апартуністычнай практыкі ў іншых галінах работы.

— Трэба падтрымаць думку тав. Гападзеда, пасьпаць дэлегацыю ў раёны, дабіцца, ва што-б там ні стала, рашучых зрухаў у тэмпах загатовак.

Тав. НАРТЫШБЛУК сваю прамову прысьвячае пытаньням жывёлагадоўлі.

— Нам трэба весьці суровы вучот кармоў. У мінулым годзе мы праваліпі справу сілаваньня. Гэта ў бягучым годзе патрэбна ўлічыць. З прычыны адсутнасьці вучоту ў нас маецца рад выпадкаў, калі ў адным калгасе вялікі недахоп кармоў, а побач у другім ёсьць значныя пішкі.

— Патрэбна наладзіць падсэл кармоў паміж асобнымі саўгасамі і калгасамі.

У канцы пасяджэньня, зьезд заслухаў рад тэлеграм рабочых заводаў, саўгасаў і калгасьнікаў.

Рапартуе „Чырвоны мэталіст“

Асоавіяхімаўская арганізацыя заводу «Чырвоны мэталіст», якая паставіла перад сабой баявую задачу сапраўднай рэалізацыі пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б у частцы забясьпячэньня абароназдольнасьці нашай краіны, правяла наступную канкрэтную працу:

1) Арганізацыя Асоавіяхіму заводу да 1-га кастрычніка 1930 г. налічвала каля 100 членаў і работа зусім была пастаўлена нездавальняюча, з 1-га кастрычніка 1930 г. па 1-га лютага 1931 г. арганізацыя заводу ўзрасла звыш 1.000 членаў Асоавіяхіму.

2) У часе правядзеньня «дэкады абароны» і «дня дырыжаблябудаўніцтва» сабрана 2.580 руб.

3) За пэрыяд з 1-га кастрычніка 1930 г. па 1-га лютага 1931 г. сабрана ўзносаў і ад падпіскі на часопіс «Авіация и химия» — 646 руб.

4) Ахоплена гурткамі вайсковых ведаў некалькі сотень членаў Асоавіяхіму.

5) Асоавіяхімаўская арганізацыя прыняла самы актыўны ўдзел у правядзьіных манэўрах.

6) У часе правядзеньня «дэкады абароны» была арганізавана адна «сквозная» брыгада па выкананьні прамфінплану ў колькасьці 45 чал.

7) Арганізацыя Асоавіяхіму заводу выклікала на сацспаборніцтва ячэйку Асоавіяхіму акулярнай фабрыкі. Арганізован стралковы цір у клюбе мэталістаў, у якім праводзіцца стралковае спаборніцтва і заняткі гурткоў.

Заканчваецца арганізацыя і абсталяваньне паказальнага асоавіяхімаўскага вайсковага габінэту.

У далейшай практыцы работы асоавіяхімаўская арганізацыя заводу паставіла перад сабой наступныя задачы:

а) Рэалізаваць білетаў 5-ай асоавіяхімаўскай лётар

Выкананьнем фінпляну узмацнім абароназдольнасьць нашай краіны

Бліскучы прыклад палітычнай сьвядомасьці ўдарнікаў заводу „Камунар“

Яны высунулі сустрэчны плян аднаразовага збору, павялічыўшы яго на 10 проц.

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ „КАМУНАР“ АБЯЦАЮЦЬ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І Ў ДАЛЕЙШЫМ З ТАКОЙ-ЖА БАЛЬШАВІЦКАЙ НАСТОЙЛІВАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЎСІХ ПЛЯНАЎ ПА ХУТЧЭЙШАЙ ПАБУДОВЕ САЦЫЯЛІЗМУ Ў НАШАЙ КРАІНЕ

Ударнікі „Энэргіі“, „Пралетара“, „Чырвонага мэталіста“ і Гомсельмаша — бярэце прыклад з камунараўцаў

Мы рабочыя заводу «Камунар», заслухаўшы даклад аб пастанове нашага ўраду сабраць з рабочых, служачых і ўсяго насельніцтва дадатковыя сродкі на культурнае і гаспадарчае будаўніцтва шляхам аднаразовага збору ў выглядзе пакаторай часткі прыбытковага падатку, ПОЎНАСЬЦЮ ЎХВАЛЯЕМ ГЭТУЮ ПАСТАНОВУ І ВІТАЕМ РАШУЧЫЯ КРОКІ НАШАГА ЎРАДУ ДА ПАШЫРЭНЬНЯ КУЛЬТУРНАГА І ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА.

Мы ведаем, што грандыёзны плян сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, які павінен завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, патрабуе вялікага напруджаньня энэргіі, сіл і сродкаў усёй рабочай клясы, усёй арміі калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас усёй краіны.

Мы былі-б дрэннымі гаспадарамі, калі-б за лік асноўных і самых неабходных затрат на будаўніцтва заводаў-гігантаў, на будаўніцтва цяжкай прамысловасьці і фарсаваньне лёгкай, павялічылі-б затраты на культурнае, гарадзкое гаспадарчае і іншае будаўніцтва. Мы на ўласных плячах адчуваем невыстарчальнае разьвіцьцё нашай цяжкай прамысловасьці, асабліва мэтаўгрічнай і каменна-вугальнай, калі з-за недахвату жалеза, чыгуну, коксу і каляровых мэталяў нашаму заводу прыходзіцца выварачваць усімі спосабамі, каб не дапускаць прастояў і не скарачаць нашых сустрэчных прамфінпляў. Так што СКАРАЧАЦЬ ЗАТРАТЫ НА ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ НЕЛЬГА НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ.

Але разьвіцьцё прамысловасьці патрабуе і культурных, добра разьвітых і падрыхтаваных рабочых, а для забесьпячэньня выкананьня і перавыкананьня прамфінпляў трэба пашырыць будаўніцтва ўсякіх устаноў, абслугоўваючых патрэбы рабочае клясы.

Для ўсяго гэтага патрэбны вялікія сродкі. І ГЭТЫЯ СРОДКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНОЙДЗЕНЫ.

Таму мы вітаем пастанову нашага ўраду аб дадатковай мабілізацыі сродкаў насельніцтва, у першую чаргу рабочае клясы і працоўнага сялянства ў дапамогу культурнаму і гаспадарчаму будаўніцтву.

Адначасова, ведаючы напружанасьць грашовага фонду культурнага і гаспадарчага будаўніцтва, МЫ РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР», сьледуючы слаўнай традыцыі сацыялістычных прадпрыемстваў Савецкага Саюзу, і нашага ў тым ліку, ВЫСОЎВАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ, АБАВЯЗУЮЧЫСЯ ПАВЯЛІЧЫЦЬ АДНАРАЗОВЫ ЗБОР З НАШАГА ПРЫБЫТКОВАГА ПАДАТКУ З 40 ПРОЦ., ДА 50 ПРОЦ, аб чым просім заўком давесьці да ведама Гарфінаддзелу.

Мы заяўляем, што сярод нас, сапраўдных ударнікаў, няма такіх, якія адмовяцца ад самаахвотнага павялічэньня аднаразовага збору мінімум на 10 проц.

МЫ ТАКСАМА ЦЬВЕРДА ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО НАШАМУ ПРЫКЛАДУ ЛАСЬЛЕДУЮЦЬ РАБОЧЫЯ ІНШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НАШАЙ КРАІНЫ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫХ ЗАВОДАЎ БССР «ЭНЭРГІЯ», «ПРАЛЕТАРЫ», ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ», «ГОМСЕЛЬМАШ» і інш.

Рабочыя «Камунара» на справе даказалі сваё імкненьне, пад кіраўніцтвам сталёвай камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, выканаць пяцігодку за чатыры гады, перавыканаўшы прамфінплян другога году пяцігодкі і ўдарнага кварталу па ўсіх паказальніках і атрымаўшы за гэта ўзнагароду адным з трох сьцягоў на ўсебеларускім конкурсе — сьцяг імя ЦК ЛКСМБ. Прычым, мэханічны цэх за лепшую работу атрымаў ад Мэталяаб'яднаньня прэмію ў 5.000 руб., На гэтыя грошы мы ўзмацняем работу ячэйкі Аўтадору, набываючы 2 аўтамабілі і 2 матацыклі.

Рабочыя заводу «Камунар» абяцаюць сваёй слаўнай камуністычнай партыі і ў далейшым З ТАКОЙ-ЖА БАЛЬШАВІЦКАЙ НАСТОЙЛІВАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЎСІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ І ПЛЯНАЎ ПА ХУТЧЭЙШАЙ ПАБУДОВЕ САЦЫЯЛІЗМУ Ў НАШАЙ КРАІНЕ.

КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЗАВОДУ «КАМУНАР».

На савецкае дырыжаблябудаўніцтва

Працоўнае сялянства вёскі Вартаўка-Сажалка, Рудзенскага сельсавету, уносіць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 16 руб. 90 кап.

— Калгасьнікі Цімашэнка, Капытаўскі, Паўлоўскі, Яфіменка, Атрашэнка, Каровіцкі, Атрашэнка П., Цімашэнка Ш., Барысенкаў, Атрошчанка, Грукаў, Тарасенка, Яфіменка Х., Целяшова П., Чаркін П. уносяць на пабудову дырыжабля Клім Варашылаў 20 руб. і выклікаюць рэшту калгаснікаў вёскі Андыкалава, Горацкага раёну.

— Працоўнае сялянства Пырашоўскага сельсавету, Вузьдзенскага раёну, у адказ на шалёную падрыхтоўку імпэрыялістамі ўзброенага нападу на СССР уносяць 52 руб. у фонд абароны краіны.

— Прафсаюзы Ветрышчыны пераралі на рахунак ЦСПСБ добраахвотных уносаў на пабудову дырыжабля «Правда» 289 руб. 09 кап. і на дырыжабль «Клім Варашылаў» 84 руб. 95 кап. Усяго 374 руб. 04 кап. З гэтай сумы на дырыжабль імя «Правда» ўнесена: арцельню каменшчыкаў тав. Мілеўскага — 102 р., райгрупкомам саўгандальслужачых — 77 руб., рабачкомам сувязі — 26 руб., мясцкомам мэдсанпрацы — 37 руб. і сэкцыяй спэцыялістаў — 47 руб.

На дырыжабль «Клім Варашылаў» унесена рабачкомам песпрамгасу 70 руб. 15 кап. і райгрупкомам саўгандальслужачых 14 руб. 80 кап.

— Калектыў Кальварыйскай школы сабраў на пабудову дырыжабля імя «Правда» 22 руб. 97 кап.

Калектыў выклікае ўсе школы Койданаўскага раёну.

Пазавайскавікі Сураскага вучпункту ўносяць у фонд пабудовы дырыжабля «Клім Варашылаў» 11 руб. 69 кап.

— Агульны сход курсантаў сьвіраводаў пры саўгасе Райцы. Талочынскага раёну, аллічаюць па 1 руб. з сваёй стыпэндыі ў фонд абароны краіны і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу курсантаў усіх іншых курсаў.

— Рабочыя і служачыя вучлесгасу аллічаюць аднадзенны заработак на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў».

— Працоўныя сяляне в. Клён, Малажаборыцкага сельсавету, Крупскага раёну, уносяць на пабудову дырыжабля імя «Правды» 40 руб.

— Члены калгасу «XII Кастрычнік», Кармянскага раёну, сабралі 8 руб. 84 к. і ўносяць на пабудову дырыжабля «Калгасьнік».

— VI зьезд саветаў Любаньскага раёну уносіць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 64 руб. 90 кап., Любаньскі райком КП(б)Б 38 руб. і раённы камітэт сялянскай узаемадапамогі 43 руб. 44 к. Усяго 146 руб. 34 кап.

— Супрацоўнікі «Беллушчаціны» для ўшанавання 50-годзьдзя наркамваенмора тав. Варашылава, а таксама ў гонар XIII гадавіны Чырвонай арміі ўносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 48 руб. і выклікаюць супрацоўнікаў Наркамгандлю і ўсіх аб'яднаньняў.

— Грамадзянін Шарамэт А. в. Шкова, Глускага раёну, уносіць у фонд дырыжаблябудаўніцтва 5 руб.

„Толькі ў СССР вольная творчая праца“

Мы, рабочыя і работніцы фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская перамога» і цэнтральнай электрастанцыі імя Леніна, заслухаўшы паведамленьне аб агіднай хлусьні, выдуманай капіталістычнымі наймітамі аб існуючай у СССР нібы «прымусовай працы», заяўляем рашучы пратэст супроць новых выпадаў клясавых ворагаў, якія, на сутнасьці, накіраваны на падрыхтоўку ваеннай інтэрвэнцыі супроць пралетарскай дыяржавы.

Капіталісты ўсіх краін узьнялі крык аб «прымусовай працы» у СССР для таго, каб прыкрыць нячуваную эксплёатацыю мільёнаў рабочых і прыгнечаных народаў калёніяльных краін, каб адцягнуць увагу, падрыхтаваць і апраўдаць працоўныя масы, як гарматнае мяса ў будучай вайне супроць СССР.

Але пралетары і працоўныя ўсяго сьвету ведаюць, што толькі ў адной краіне — СССР ёсьць вольная творчая праца, што пралетарыят СССР будуе новае жыцьцё, будуе сацыялістычнае грамадзтва.

Толькі ў СССР існуе вольная праца. У нас рабочыя, арганізаючыся ва ўдарныя брыгады, сваім энтузіязмам забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў пабудовы сацыялізму.

Нашым адказам на капіталістычную брахню аб прымусовай працы ў СССР будзе выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

У найкарацейшы тэрмін выканаем словы нашага правадыра — тав. Сталіна аб апаладаньні зброяй тэхнікі, паставім яе на службу рабочай клясе ў барацьбе за сацыялізм.

Будзем бязупынна ўзмацняць баяздольнасьць Чырвонай арміі — надзейнага абаронцы Кастрычніцкай рэвалюцыі і краіны вольнай працы.

Няхай жыве УсеКП(б)!

Няхай жыве міжнародная рэвалюцыя!

Няхай жыве Чырвоная армія!

Гадавіну сустрэлі моцным прылівам у калгасы

У 13-ую гадавіну РСЧА чырвонаармейскія часьці Беларускай ваеннай акругі вылучаюць новых байцоў-ударнікаў за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

«У адказ на правакацыйныя вылазкі камісіі Фіша,—пішуць у сваёй заяве 12 байцоў № роты Савачкін, Чарнік, Бурылаў, Качалаў, Дулін, Жандараў, Сьцяпанін, Вэтнэр, Качан, Лукашэвіч, Галавач і Сяржант,—мы ўступаем у калгасы».

Узорны ўдарнік № стралковай роты Авараў запісаўся ў калгас, заявіўшы:

«Зараз, як ніколі, вёска патрабуе рашучых ініцыятараў і арганізатараў новых сацыялістычных форм працы. Абазываюся быць ініцыятарам і арганізатарам новых калгасаў пад кіраўніцтвам партыі».

Партыйна-камсамольская ячэйка № роты ўступіла ў перасяленчыя далёкаўсходнія камуны. Прыкладу ячэйкі пасьледавалі 35 лепшых ударнікаў беспартыйных чырвонаармейцаў № стралковага палка.

У № стралковым палку 40 курсантаў-варашылаўцаў, абвясьцілі сябе ўдарнікамі, запісаліся ў калгасы.

Сталі калгасьнікамі 37 слухачоў № палкавой школы. Сем'і 12 курсантаў таксама ўступілі ў калектывы.

7 курсантаў санітарна-інструктарскіх курсаў пры віцебскім вайсковым шпіталі ўступілі ў калгасы, заключыўшы паміж сабою сацдагавор на ўдарнае правядзеньне бальшавіцкай сяўбы і разгортваньне масавай работы па арганізацыі новых калгасаў.

У № артылерыйскім палку за адзін дзень у калгасы запісаліся 64 ударнікі.

В. Сьвірыдаў.

УСЕСАЮЗНЫ СУБОТНІК ДАПАМОГІ ТРАНСПАРТУ — вось адказ пралетараў Савецкага Саюзу містэрам Фішам на байкі аб „прымусовай працы“ ў СССР

У Беларусі, якая раней прыгнятаецца царызмам і была прыдушана, працоўныя масы беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, пад кіраўніцтвам сваёй камуністычнай партыі, працуюць над заканчэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Наша гарбарня ў Менску, дзякуючы падтрыманьня адсталай у эканамічных адносінах БССР з боку рабочай клясы ўсяго Савецкага Саюзу, на аснове правядзеньня ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі, вырасла з маленькіх, карлікавых саматужных майстэрань у магутную гарбарню з вытворчай праграмай на 1931 г. у 10 з лішнім мільёнаў руб.

Усе гэтыя вялічэзныя посьпехі маглі быць дасягнуты толькі дзякуючы таму асноўнаму, чаго ня было, няма і ня можа быць ні ў адной капіталістычнай краіне, — што ў нашай краіне мы працуем на сябе, а не на капіталістаў.

За гэрайчныя намаганьні ў стварэньні нашай гарбарні мы два гады таму назад былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Працоўнага Сьцягу.

На падставе нашых дасягненьняў мы ў мінулым годзе перайшлі на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Узьняцьцем прадукцыйнасьці працы і сацыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці мы з пераходам на 7-мігадзінны рабочы дзень ня толькі ня зьменшылі праграмы нашай прадукцыі, АЛЕ ЯШЧЭ ПАВЯЛІЧЫЛІ ЯЕ.

Разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мы з гонарам выканалі павялічаную праграму 1929-30 г.

За ўдарны квартал мы яшчэ больш пашыраную праграму прамфінпляну ня толькі выканалі, але і перавыканалі па ўсіх, як колькасных, так і якасных паказальніках, і на Ўсебеларускім конкурсе ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сьцягам імя ЦСПСБ.

На дасягнутых посьпехах мы ня спыніліся і разьвіваем іх у бягучым трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Замест 342 рацыяналізатарскіх прапаноў за ўвесь 1929-30 г. мы за адзін ударны квартал далі 296 прапаноў.

Рэзультаты нашых гэрайчных намаганьняў Фіш і К° хочуць вытлумачыць агіднымі выдумкамі, што «у СССР панує прымусовая праца, і на яе плячох ідзе ажыцьцяўленьне пяцігодкі».

Што прымушае капіталістаў так нагла хлусіць на працоўных Савецкага Саюзу — для нас ясна.

Мы ведаем, што «пэрспэктыва рашаючай перамогі ня можа ня выклікаць новага выбуху энтузіязму і новага працоўнага ўздыму сярод рабочых і сялян. Але яна ня можа таксама не ўзмацніць нянавісьці і злосьці нашых клясавых ворагаў». (З рэзалюцыі сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Спроба ворагаў усяляк сарваць наша будаўніцтва — крыжовым паходам папы рымскага, кампаніяй супроць «савецкага дэмпінгу» — цяпер дапаўняецца хлусьнёй аб прымусовай працы ў СССР.

КРЫКАМ АБ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ Ў СССР КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ ХОЧУЦЬ ПАДРЫХТАВАЦЬ ВАЙНУ СУПРОЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ І АДНАЧАСОВА ЎТАЮЦЬ САПРАЎДЫ ПРЫМУСОВУЮ ПРАЦУ, ШТО ІСНУЕ ВА ЎСІХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ І КАЛЁНІЯХ.

ПАДТРЫМЛІВАЮЧЫ ПАТРАБАВАНЬНЕ АБ СТВАРЭНЬНІ МІЖНАРОДНАЙ КАМІСІІ З ПРАДСТАЎНІКОЎ САВЕЦКАГА І МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ДЛЯ ДЭТАЛЁВАГА АБСЬЛЕДВАНЬНЯ УМОЎ ЖЫЦЬЦЯ РАБОЧЫХ І БЕСПРАЦОЎНЫХ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ І КАЛЁНІЯХ.

МЫ ЛІЧЫМ НЕАБХОДНЫМ ДЛЯ ПЕРАМОГІ ТРУДНАСЬЦЯЙ, ШТО МАЮЦЦА НА ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ, ПРАВЕСЬЦІ ЎСЕСАЮЗНЫ СУБОТНІК ДАПАМОГІ ЧЫГУНЦЫ.

На абарону СССР, супроць панаваньня капіталу, за сусьветны Кастрычнік!

За камуністычны суботнік дапамогі транспарту!

Выканаем прамфінпляй па ўсіх, асабліва якасных, паказальніках.

РАБОЧЫЯ МЕНСКАЙ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК».

* * *

Агульна-заводзкі мітынг рабочых і служачых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу «Ударнік», заслухаўшы інфармацыю аб антысавецкай кампаніі ў буржуазных капіталістычных краінах, з абурэньнем ганьбіць байкі буржуазіі аб надзявольнай працы ў СССР у той час, як у калёніях капіталістычных краін Англіі, Францыі, Амэрыкі існуе самая сапраўдная надзявольная праца і «свабоднае» беспрацоў'е.

Рабочая кляса СССР, пад правільным кіраўніцтвам УсеКП(б) і яе ЦК, дабілася вялізарнейшых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве. У нас, у СССР, няма беспрацоў'я. Рабочы дзень у СССР зьяўляецца самым мінімальным ва ўсім сьвеце — 7-мі гадзінным. Буржуазіі ня ўдасца ўтаіць усіх нашых дасягненьняў ад рабочых капіталістычных краін. Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады зьяўляецца вынікам энтузіязму рабочай клясы, якая высунула новыя камуністычныя мэтады працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы, рабочыя і служачыя заводу «Ударнік» у адказ на ўсю гэтую агідную кампанію буржуазіі, накіраваную супроць нашага пераможнага будаўніцтва, арганізоўваем камуністычны суботнік на дапамогу транспарту і ўсе, як адзін, выйдзем на працу ў выхадны дзень. Гэта будзе лепшым адказам буржуазіі на яе правакацыйны паклёп супроць першай у сьвеце пралетарскай дыяржавы.

Няхай жыве камуністычная партыя — правадыр пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Абгаварыўшы паведамленьне аб новай антысавецкай кампаніі буржуазіі мы, рабочыя Чырвонаштандартнай шкіпнай фабрыкі «Кастрычнік» з абурэньнем кляцімім наглую хлусьню цьвёрдалобых аб нібы прымусовай працы ў СССР. Мы разумеем да чаго вядзе гэтая новая паклёпніцкая кампанія.

Міжнародная буржуазія разам са сваімі лёкаямі — сацыял-фашыстамі, баіцць у ажыцьцяўленьні нашай пяцігодкі сваю пагібель. Яна імкнецца сарваць наша пасьпяховае наступленьне на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Але ёй гэты подлы замысел ня ўдасца. Ёй ня ўдасца ашукаць рабочую клясу капіталістычных краін. Рабочыя ўсіх краін бачаць нашы посьпехі і разам з намі радуюцца гэтаму. Яны ведаюць, што ні ў адной буржуазнай краіне праца не карыстаецца той пашанай, якой карыстаецца ў нас — у СССР.

Яны ведаюць, што ў нас ужо няма беспрацоў'я. Усім рабочым замежных краін вядома, што мы будуем сацыялізм на грунце сацыялістычных адносін да працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

У адказ на гэты паклёп мы, рабочыя фабрыкі «Кастрычнік», прымаем вынік пралетарскага заводу і арганізоўваем камуністычны суботнік па ўзмацненьні нашага адстаючага вучастку — транспарту. Мы заклікаем усіх рабочых Менску і Беларусі далучыцца да нас і арганізаваць усебеларускі суботнік. Гэта будзе лепшым адказам на хлусьню капіталістаў і сацыял-прахвостаў. Гэта будзе лепшай рэалізацыяй адозвы УсеЦСПС і НКШЗ.

Мы абавязуемся яшчэ шырэй разгарнуць камуністычныя мэтады працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выканаць і перавыканаць прамфінплян 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Мы яшчэ мацней згуртуем свае рады вакол камуністычнай партыі, яшчэ вышэй узьнімем хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, вывучэньне вайсковых ведаў, чым узмацнім абароназдольнасьць нашай краіны.

Няхай жыве савецкі саюз — бацькаўшчына сусьветнага пралетарыяту!

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— Дом Асьветы. У 19 гадз.—ураўсты вечар асьветнікаў з навуковымі працаўнікамі сумесна з падшэфнай вайсковай часьцю, прысьвечаны 13 гадавіне Чырвонай арміі. Уваход па членскіх білетах.

— У 19 з пал. гада., у памяшканьні псыха-нэўралёгічнага дыспансэру (вул. Валадарская, 16) — нарада дактароў дыспансэру сумесна з дактарамі мэдпунктаў і прадстаўнікамі камісій аховы здароўя буйнейшых прадпрыемстваў г. Менску па пытаньні абслугоўваньня прадпрыемстваў дыспансэрам і арганізацыі савету сацыяльнай дапамогі. Просьба зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

— 24 лютага, у 6 гадз. вечара, у шамашк. НК РСІ (Савецкая, 55, ніжні паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў НК РСІ, на якім будуць разгледжаны наступныя пытаньні: 1) Справа аб недахопах у рабоце закрытага разьмеркавальніка МЦРК ф-кі «Кастрычнік». 2) Справа аб выдачы талёнаў на атрыманьне без чаргі матрацаў працаўнікамі МЦРК. 3) Справа аб няўважлівых адносінах да запытаньняў бюро скаргаў з боку заг. крамы МЦРК № 13. . 4) Справа аб няўважлівых адносінах да працэсэі з боку працаўнікоў МЦРК. 5) Аб зьніканьні спраў з канцылярыі Белкалгасцэнтру. 6) Справа аб грубых адносінах да беспрацоўных з боку загадчыка біржы працы тав. Шмэльца. 7) Справа студэнткі Нартасу БДУ Кудэінэр. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т.: Шутэкін, Макаўчык, Камароўская — лямп. ф-ка, Гардон, Машко—Дом Ураду, Эйдэльман, Гушча—друк. «Зьвязда», Грыб, Круглянская і Жданові—дэпо.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 33.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-17
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дармовым дадаткам „Правруч“)

На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., нонпарэйлі абвесткі — 1 р. за радок. Пасьля тэксту — у два разы дарожэй. Кантэнарытны рахунак выдавецтва № 52100601 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторах выдавецтва „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая 33, 2-ы паверх тэл. 7-31.

Сёньня, 22 лютага. Паказ для Дому Чырвонай Арміі Пач. а 8 гадзе

Беларускі дзяржаўны тэатр

В. Кіршон.

РЭЙКІ ГУДУЦЬ

Пьеса ў 5 дзеяньнях. 12 абразох.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“

З ПАНЯДЗЕЛКА, 23 ЛЮТАГА

З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ

2-гі ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ 2-гі

Савецкі фільм вытворчасьці «Працкіно»

ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ

Рэжысэр-аператар — Альфрэд ДОБЭЛЬТ.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Л. СЯМЁНАВА, К. ДЗЯНІСАВА, С. МІНІН, В. САВІЦКІ.

ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ ў 6 гадз.

КАСА — з 4 гадз. 30 хв.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“

З ПАНЯДЗЕЛКА, 23 ЛЮТАГА

новы савецкі фільм вытворчасьці «Саюзкіно»

ВАЙНА-ВАЙНЕ

Фільм пабудаваны на падставе дакумантаў 1914—1918 г. г. Цэнтрархіву.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ

БРАЦІШКІН СПАБОРНІЧАЕ

ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ ў 6 гадз. 30 м., 2-га—8 гадз., 3-га—9 гадз. 20 м., 4-га—10 гадз. 45 м.

КАСА — з 4 гадз.

Кіно-тэатр „Чырвоная зорка“

З ПАНЯДЗЕЛКА, 23 ЛЮТАГА

Новы мастацкі фільм вытворчасьці УЗБЭКДЗЯРЖКІНПРАМ

АПОШНІ

БЭК

Рэжысэр Ч. САБІНСКІ.

Хроніка Саюзкіно № 3.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ

ГУКАВЫ ФІЛЬМ

Папярэдні продаж білетаў у тэатр раб. касе.

Пачатак сэансаў — 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.

Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Асобы, якія спозьняцца, на сэанс не дапускаюцца.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР“

З ПАНЯДЗЕЛКА, 23 ЛЮТАГА

эпізод барацьбы з басмацтвам

ШАКАЛЫ РАВАТА

Кіно-п'еса ў 9 частках.

Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня.

Каса адкрыта з 12 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“ — КІНО ЗАКРЫТА да 2 сакавіка.

Кіно „Спартак“

З ПАНЯДЗЕЛКА, 23 ЛЮТАГА

выдатны трука-прыгодніцкі фільм

НАПОЛЕОН-ГАЗ

у 7 частках.

Пачатак сэансаў: 7 г. 9 г., 10 г. 45 м.

Каса — з 5 гадз.

Цэнтральная камісія ЦКК РСІ

ПАЧЫНАЕ

АСАБІСТУЮ ЧЫСТКУ ПРАЦАЎНІКОЎ АПАРАТУ БЕЛМЯСА.

Кампрамэтуючыя матар'ялы, якія ёсьць, просьба накіроўваць у цэнтральную камісію, Менск, Рэвалюцыйная, 3.

Асабісты прыём ад 10 да 15 гадз. там-жа.

КАМІСІЯ.

У аўторак, 24-га лютага, у 8 гадзін вечара, у памяшканьні Белдзяржтэатру

Вышэйшым Саветам Фізычнай Культуры Беларусі і Цэнтральным Саветам Асавіяхіму арганізуецца

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР,

прысьвечаны дню сьвяткаваньня XIII-ай гадавіны Чырвонай арміі, усебеларускай і усесаюзнай зорнай вазнічаазнай лыжнай эстафеты: „гатоў да працы і абароны краіны Саветаў“

ПРАГРАМА ВЕЧАРА:

1. Урачыстая частка.
2. Даклад нам. старшыні ЦС Асавіяхіму і члена прэзыдыуму ВСФКБ тав. ДРЫЛЁНКА аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР і задачах абароны краіны.
3. Мастацкая частка (Бел Дзярж. Тэатр).

Уваход па разданых білетах.

АБЯВА.

23 ЛЮТАГА ў 7 гадзін вечара

АДБУДЗЕЦЦА

СХОД КАМУНІСТАЎ — НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ І АСЬПІРАНТАЎ БАН, у агульнай залі БАН,

Парадак дня:

1) Аб бліжэйшых задачах БАН (дакладчык т. ГОРЫН).
2) Выніні правядзеньня кампаніі па дадатковых выбарах новых акадэмікаў БАН (дакладчык т. Шчарбакоў).

На сход павінны зьявіцца і без спазьненьня наступныя т. т.: Рыдлін, Садоўскі, Мацюкевіч, Бэндэ, Кенаплін, Вельфсон, Крывіцкі, Валабрынскі, Галанза, Выдра, Сакерская, Шапавалаў, Якубчык, Матулайціс, Шкільтэр, Крукоўскі, Ганчарык, Усьпенскі, Броўкін, Агульнік, Бутневіч, Грачык, Пратасеня, Лойка.

Акрамя гэтага таксама павінны зьявіцца ўсе іншыя навуковыя працаўнікі і асьпіранты — партыйцы Акадэміі:

Прэзыдыум акадэміі.

24 ЛЮТАГА а 2 гадзіне дня

адбудзецца

Ў АГУЛЬНАЙ ЗАЛІ БАН

СХОД УСІХ АСЬПІРАНТАЎ

інстытуту асьпірантуры Акадэміі

Парадак дня:

1) Бліжэйшыя задачы БАН і падрыхтоўка новых кадраў (дакладчык тав. Горын).
2) Аб дадатковых выбарах новых акадэмікаў БАН (дакладчык тав. Шчарбакоў).

На сход павінны зьявіцца ўсе асьпіранты інстытуту асьпірантуры БАН і без спазьненьня.

ПРЭЗЫДЫУМ АКАДЭМІІ.

Даводзіцца да ведама ўсіх студэнтаў вячэрняга Камвузу, што

ЗАНЯТКІ 23-II 1931 г. НЕ АДБУДУЦЦА

з прычыны таго, што большасьць студэнтаў будуць заняты на вечарох, прысьвечаных Чырвонай арміі.

Заняткі пераносяцца на 25-II-31 г.

Вячэрні Камвуз.

БЕЛРЫБА паведамляе, што праводзіцца

ЧЫСТКА

ЯЕ АПАРАТУ.

Просьба да ўсіх рабочых і служачых падаваць у камісію па чыстцы (Рэвалюцыйная вул. д. № 3) матар'ялы што характарызуюць работу як усяго апарату Белрыбы ў цэлым, так і паасобных працаўнікоў.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

Фатаграфія БЕЛДЗЯРЖКІНО

(САВЕЦКАЯ 81)

для дэлегатаў X Усебеларускага зьезду саветаў

РОБІЦЬ ФОТАЗДЫМКІ

БЯЗ УСЯКАЙ ЧАРГІ

са скідкай 50 проц. з устаноўленага тарыфу.

Фатаграфія адкрыта штодзённа з 10 гадз. раніцы да 6 гадз. веч.

Белдзяржкіно.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ“ прымаюцца да 2 гадз. дня

ЧАЧЭРСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ

АБВЯШЧАЕ

ВЕСНАВЫ НАБОР

НА ПЕРШЫ КУРС ТЭХНІКУМУ.

Заявы падаюцца на адрасе: м. Чачэрск (Гомельшчына), сьвінагадоўчаму тэхнікуму да 10 сакавіка 1931 г. в прыладжаньнем усіх дакумантаў, згодна даведніка НКА за 1930-31 год.

З 10 па 15 сакавіка праводзяцца іспыты асобам, якія ня маюць права паступіць у тэхнікум бяз іспытаў.

Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй, як і ў іншых тэхнікумах.

Заняткі пачынаюцца з 1 красавіка 1931 г., аб чым заінтэрэсаваным будзе паведамлена пэрсанальна.

Дырэктар тэхнікуму СУКОНЬНІКАЎ.

НА ГОМЕЛЬСКАЙ ГРЫБНОЙ БАЗЕ БЕЛСАДГАРОДНІНЫ з 25-II—31 г. пачынаюць працу

МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ

па падрыхтоўцы кадраў грыбнікоў.

Просьба да ўсіх райспажтаварыстваў і райкопаў, якім прадастаўлены месцы на курсах цэнтральнымі кіраўніцтвамі Белкаапсаюзам і Белсадгародам, камандыраваць да паказанага часу адпаведных асоб-слухачоў з ліку працаваўшых таварышоў па загатоўках у мінулым сэзоне і актыву кампамольскай моладзі і калгасна-бядняцкага актыву моладзі. Просьба да райкомаў ЛКСМ дапамагчы райкопам у напраўку вылучэньня кандыдатур для паказаных курсаў.

Курсанты павінны мець пры сабе даведкі: аб сацстановішчы, прады, вэнсіі, і пасьцельныя прылады. Інтэрнат забясьпечан.

БЕЛСАДГАРОДНІНА.

Камуністычны Унівэрсытэт Беларусі імя ЛЕНІНА

абвяшчае

КОНКУРС

на замяшчэньне пасады аднаго АСЫСТЭНТА і аднаго ЛЯБАРАНТА па агульнай хэміі.

Асобы, якія жадаюць прыняць удзел у конкурсе, павінны не позьней 10-га сакавіка падаць свой жыцьцяпіс па наступным адрасе: МЕНСК, Унівэрсытэцкая, 27, КУБ катэдры хэміі.

ВУЧЭБНАЯ ЧАСЬЦЬ КУБ.

У выпадку неакуратнага атрыманьня газэты ЗВАНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ і дакуманту 1 р.

ЗГУ